ПРЫБЫТКУ Ў ХАЦЕ — ШТОГОД ПА ДЗЩЯЦІ!

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 СНЕЖНЯ 2012 г. СУБОТА № 250 (27365) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Апошнія лісткі ў календары...*
*Сыходзіць год — самотны і стары.*
*Ніхто яго за фалды не трымае:*
*Навошта, калі Новы наступае?*

*І верыцца: вось гэты — не падмане:*
*Каму што трэба —*
*з-пад зямлі дастане!*
*Каму — здароўе без ніякіх лекаў,*
*Каму да пары — цуда-чалавека,*

*Па сэрцы справу — з добраю зарплатай,*
*Якой, напэўна, хопіць на ўсе траты,*
*Асобны дом — хай для пачатку й цесны,*
*Але ж каб там спявалі дзеткам песні...*

*Да іх — машыну, водпуск — хто дзе хоча,*
*Паўнюткія лагоды дні і ночы...*
*Яшчэ б — цяпла усім ды ласкі Божай,*
*З якою ўсё ліхое пераможаш...*

*Апошнія лісткі ў календары...*
*Сыходзіць год — самотны і стары.*
*Ніхто яго за фалды не трымае:*
*Навошта, калі Новы наступае?..*

*Валянціна ДОЎНАР.*

ISSN 1990 - 763X

## По жыцці — з творчым настроем!

Вось і яшчэ адзін год адыходзіць у небыццё, знікае, забіраючы з сабой усё, чым мы яшчэ нядаўна жылі... Нашы радасці і беды, перамогі і паражэнні, набыткі і страты, увасобленыя ў жыццё мары і нерэалізаваныя амбіцыі.

Мы набліжаемся да чарговай мяжы, каб, перасягнуўшы яе, на імгненне запаволіць свой крок, азірнуцца назад... І падумаць пра тое, якімі мы былі на гэтым чарговым адрэзку часу: колькі змаглі аддаць, чаму здолелі навучыць, што стварылі... Бо першапачаткова кожны чалавек — творца. Ён прыходзіць у гэты свет, каб ашчаслівіць яго новымі ідэямі. Каб самарэалізавацца і пакінуць след — у сэрцах і душах мільёнаў ці... у адной адзінай душы і ў адным адзіным сэрцы.

Быць творцам — гэта крыху больш, чым быць дзіваком і адрозніваццa ад іншых. Быць творцам — значыць штодзень выкарыстоўваць свае магчымасці для стварэння чагосьці новага. І зусім не абавязкова для гэтага вынаходзіць тэорыю адноснасці, ствараць сімфанічную паэму ці маляваць чорны квадрат... Дастаткова творча падыходзіць да кожнай праявы жыцця, а чарговыя цяжкасці і перашкоды ўспрымаць як штуршок да руху наперад...

Эксперыментуйце, прыдумляйце, вынаходзьце... Шукайце неардынарныя рашэнні стандартных пытанняў... Стварайце! І тады ваша жыццё і жыццё тых, хто побач з вамі, будзе сапраўды цікавым і разнастайным.

Менавіта гэтага, дарагія чытачы, жадаюць вам супрацоўнікі «Звязды», а таксама героі нашага навагодняга нумара!

# ДЗЯЦІНСТВА ПАВІННА БЫЦЬ ШЧАСЛІВЫМ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора наведаў дзіцячы дом № 2 у Мінску. Кіраўнік дзяржавы разам з сынам Мікалаем павіншаваў выхаванцаў гэтай установы і ўручыў ім навагоднія падарункі, перадае БЕЛТА.**



Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з умовамі жыцця дзяцей, пагутарыў з імі. Малыя запрасілі гасцей на чаяпіцце, падчас якога Аляксандр Лукашэнка гутарыў з дзецьмі, цікавіўся, як яны вучацца, чым захапляюцца. Выхаванцы дзіцячага дома — вельмі таленавітыя хлопчыкі і дзяўчынкі, яны займаюцца ў розных гуртках, захапляюцца спортам, вучацца шыць, вязаць, рабіць розныя рэчы, гатаваць.

На сустрэчы з Прэзідэнтам прысутнічалі не ўсе выхаванцы, паколькі многія з іх у гэтыя навагоднія святы знаходзяцца на аздараўленні ў Італіі. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ўмовамі аздараўлення і тым, ці задаволены дзеці адпачынкам. Выхавальнікі і дзеці расказалі, што ніякіх праблем падчас аздараўлення не ўзнікае.

Прэзідэнт падкрэсліў, што падчас візіту ў Ватыкан і сустрэчы з Папам Рымскім якраз ішла размова аб аздараўленні беларускіх дзяцей у Італіі. Аляксандр Лукашэнка сказаў, што важныя гарантыі, каб з дзецьмі ўсё было ў парадку. І падчас сустрэчы з Папам Рымскім атрымаў запэўненні аб такіх гарантыях.

Выхаванцы дзіцячага дома № 2 не толькі пагутарылі з Аляксандрам Лукашэнкам, але і разам з ім сталі гледачамі цудоўнага шоу, якое падрыхтавалі артысты Белдзяржцырка. Усім дзецям былі ўручаны падарункі, ласункі і тарты. У сваю чаргу дзеці ўручылі гасцям зробленыя сваімі рукамі падарункі.





Фотаздымкі БЕЛТА.

# ПРЭЗІДЭНТ РАЗГЛЕДЗЕЎ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 28 снежня разгледзеў кадравыя пытанні. Аб гэтым БелТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

**Кіраўнік дзяржавы назначыў:**

Дзераха Віталя Пятровіча — намеснікам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь;

Прашко Ігара Браніслававіча — старшынёй Магілёўскага абласнога суда.

**Прэзідэнт даў згоду на назначэнне:**

Агароднікава Аляксандра Сяргеевіча — намеснікам міністра прамысловасці;

Рагачова Яўгена Валер'евіча — першым намеснікам міністра транспарту і камунікацый;

Стадольніка Валерыя Францавіча — старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Мінскай вобласці;

Баско Дзмітрыя Вікенцьевіча — старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Брэсцкай вобласці;

Герасімава Васіля Мікалаевіча — старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці;

Банчука Віктара Леанідавіча — першым намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама;

Трызну Віктара Міхайлавіча — намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама;

Дамарацкага Андрэя Уладзіміравіча — намеснікам старшыні Мінскага гарвыканкама;

Сучкова Міхаіла Уладзіміравіча — старшынёй Беларускага дзяржаўнага канцэрна па вытворчасці і рэалізацыі тавараў лёгкай прамысловасці;

Валчка Уладзіміра Фёдаравіча — генеральным дырэктарам вытворчага аб'яднання «Мінскі трактарны завод» — генеральным дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскі трактарны завод»;

Асноўскага Віктара Анатольевіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскі аўтамабільны завод» — кіруючая кампанія холдынга «БелаўтаМАЗ»;

Камко Аляксандра Іванавіча — генеральным дырэктарам вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш» — дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Гомельскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання «Гомсельмаш»;

Гунько Сяргея Марцінавіча — генеральным дырэктарам вытворчага аб'яднання «Віцязь» — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Віцязь»;

Лебедзевай Святланы Мікалаеўны — рэктарам установы адукацыі «Беларускі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі».

# «НАМ ГЭТУ ПАВАГУ ТРЭБА ЗАХАВАЦЬ...»

Пытанні развіцця Беларускай калійнай кампаніі і ў цэлым сітуацыя на сусветным калійным рынку абмяркоўваліся на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі 28 снежня з членам Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі — акцыянерам ААТ «Уралкалій» Сулейманам Керымавым.

Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў прыхільнасць да заяўленай раней пазіцыі, накіраванай на далейшае развіццё кампаніі, узмацненне яе ўплыву.

«Як мы абяцалі, мы будзем прытрымлівацца гэтага курсу, і мы тут абсалютна адкрытыя, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Я ніколі не адыду ад той практыкі, якая сёння склалася, і я ніколі не зраблю так, як не абяцаў».

«Наша кампанія ўсё ж мае моцны аўтарытэт у свеце, і на калійным рынку — і кітайцы, і бразільцы, і індыйцы — усе пра нас гавораць толькі пазітыўна, і, відаць, што калі ім нават нешта не падабаецца, асабліва цэны на наш тавар, то яны з павагай ставяцца да нас, і нам гэту павагу трэба захаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу Сулейман Керымаў адзначыў, што настроены на прадаўжэнне сумеснай работы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

■ Будзь у курсе

# З ПІРАТЭХНІКАЙ НА ГУЛЯННІ НЕЛЬГА

**У сувязі з працяглым характарам святочных мерапрыемстваў, а таксама іх правядзеннем у вячэрні і начны час у перыяд з 31 снежня па 1 студзеня намаганні сталічных праваахоўных органаў традыцыйна будуць сканцэнтраваны ў месцах масавых гулянняў і на прылеглых тэрыторыях.**

Каля Палаца спорту і Нацыянальнай бібліятэкі іх плануецца агарадзіць мабільнымі турнікетамі. Праход будзе праз спецыялізаваныя пункты пропуску з ужо звыклай для гараджан і гасцей сталіцы працэдурай асабістага дагляду з выкарыстаннем як ручных, так і стацыянарных металадэтэктараў. Узяць пад кантроль плануецца таксама пляцоўку каля стэлы «Мінск — горад-герой», дзе ў 1 гадзіну 30 хвілін адбудзецца навагодні феерверк. Акрамя таго, пры вялікім наплыве грамадзян не выключаецца магчымасць выстаўлення мабільных турнікетаў і пры правядзенні мерапрыемстваў у мікрараёнах.

У ахоўваемыя месцы не будуць дапускацца грамадзяне нападпітку. Таксама будзе забаронена праносіць з сабой спіртныя напоі, піва, іншыя напіткі і вадкасці (за выключэннем вады і напояў у празрыстай ёмістасці аб'ёмам не больш за 0,5 літра). Не прапусціць і з прадметамі, якія могуць нанесці шкоду ці цялесныя пашкоджанні навакольным, выбуханебяспечнымі і іншымі рэчывамі сродкамі, забароненымі да свабоднага доступу, а таксама з хатнімі жывёламі. Абмежаванні распаўсюджваюцца і на піратэхнічныя вырабы (петарды, ракеты, феерверкі), асабліва падкрэслілі ў прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама. За незаконнае выкарыстанне піратэхнікі прадугледжана адміністрацыйная адказнасць ад штрафу да арышту.

Каб забяспечыць дарожную бяспеку, магчыма абмежаванне руху транспарту. Метрапалітэн закончыць сваю працу ў 3 гадзіны 1 студзеня, а распачне зноў ужо ў 5.30 першых сутак 2013 года. Да 5.30 раніцы будзе прадугледжана праца наземнага пасажырскага транспарту.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Падзея

# БЕЛАРУСЫ АДДАЮЦЬ ПЕРАВАГУ ТРАДЫЦЫЙНАЙ ДРУКАВАНАЙ КНІЗЕ

**Такое меркаванне выказаў учора журналістам міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі пасля адкрыцця ў Мінску новай кнігарні «Кнігі & кніжачкі» на месцы добра вядомых гараджанам «Падпісных выданняў» на праспекце Незалежнасці, перадае БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

Міністр інфармацыі адзначыў, што з-за таго, што зараз набіраюць папулярнасць электронныя кнігі, далёка не ва ўсіх краінах могуць сабе дазволіць адкрываць новыя кніжныя крамы. Між тым ААТ «Белкніга» на працягу гэтага года адкрывае, па яго словах, ужо другі ці трэці. «Пакуль у сілу пэўнага кансерватызму нашых людзей кнігагандаль аддае перавагу друкаваным кнігам, хоць выдавецтвы гатовыя і ўжо пачалі выпускаць кнігі на электронных носьбітах», — сказаў Алег Праляскоўскі.

Ён паведаміў, што ў Беларусі ў сярэднім на аднаго чалавека выдаецца 3,5-4 кнігі — гэта еўрапейскі ўзровень. Алег Праляскоўскі нагадаў, што некалькі гадоў таму ў Беларусі было прынята рашэнне аб'яднаць разрозненыя кнігагандлёвыя арганізацыі ў адзіную гандлёвую сетку, што прынесла свой плён. «Белкніга», нягледзячы на няпростыя ў эканамічным плане гады, працуе прыбыткова, эканамічна незалежная», — падкрэсліў міністр.

У адкрыцці кнігарні «Кнігі & кніжачкі» прыняў удзел першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Радзькоў. Ён азнаёміўся з асартыментам, агледзеў сучасную гандлёвую залу, якая была значна пашырана. У адрозненне ад «Падпісных выданняў», якія пазіцыянавалі сябе як крама, што гандлюе толькі беларускімі выданнямі, «Кнігі & кніжачкі» абзавяліся шырокім аддзелам замежнай літаратуры. Кнігі замежных аўтараў магазін будзе атрымліваць напрамую, а не завозіць іх праз Расію.

■ Віншаванне з космасу

# «ХТО-ХТО... АЛЕГ НАВІЦКІ!»

## Наш касманаўт з борта МКС «разглядзеў» удачу для землякоў у наступным годзе




От всей души поздравляю своих земляков, Жителей Беларуси с наступающим Новым Годом! Здоровья, радости, удачи и всего самого наилучшего! О. Новицкий

**Вось ужо два месяцы на Міжнароднай касмічнай станцыі (МКС) знаходзіцца наш зямляк, трэці беларускі касманаўт, ураджэнец Чэрвеня, мой аднакласнік Алег Навіцкі. Два месяцы, а здаецца, што было тое толькі ўчора. Старт транспартнага пілатуемага карабля "Саюз ТМА-06М" пад яго камандаваннем, стыкоўка, хваляванні, слёзы, радасць і такі гонар... Зрэшты, усе гэтыя пачуцці захоўваюцца і зараз.**

Ад свайго аднакласніка ведаю, што яго дзень распісаны па хвілінах. Бывае, нават у выхадныя не да адпачынку. Прадбачачы працяглы перапынак у ліставанні пасля прыбыцця другога экіпажа, зараней папрасіла Алега, калі гэта магчыма, даслаць усім землякам віншаванні з Новым годам, напісаныя на паперы і сфатаграфаваныя. А яшчэ — уласны фотаздымак з Міжнароднай касмічнай станцыі.

Віншаванні з космасу... Такога ў маім жыцці яшчэ не было. Зрэшты, як і электронных лістоў з касмічнай станцыі, і... тэлефанавання! Так-так, нарэшце пашанцавала і мне. Хаця, як аказалася, амаль выпадкова: проста Алег не дазваніўся на некалькі нумароў і тады прыгадаў мой... Але, значыць, так у той дзень выстраіліся зоркі — на маю карысць!

Адбылося гэта амаль напрыканцы працоўнага дня. Занятая сваімі справамі, толькі зірнула на незнаёмы нумар, але нават і не падумала, адкуль званок. Адказаўшы, пачула... ну абсалютна незнаёмы голас: «Света, прывітанне!» Не прыдумаўшы нічога лепшага, спыталася: «А хто гэта?» І раптам у адказ — такі злёгку бурклівы голас: «Хто-хто... Алег Навіцкі!»" О, вось тут ужо выгукнула на ўсю моц лёгкіх!

Падчас васьміхвіліннай размовы старалася больш слухаць, чым гаварыць. Атрымлівалася ж... наадварот. Даведалася, што Алег у захапленні ад захадаў і світанкаў, якія за суткі можна ўбачыць... ажно 16 разоў! І гэтае відовішча яму не надакучае. Шкада толькі, што няма столькі вольнага часу — проста знаходзіцца каля ілюмінатара і бачыць, як дзень змяняе ноч і наадварот. Значыць, і Новы год Алег і яго калегі могуць сустрэць... 16 разоў! Нішто сабе! Вось гэта дзіва!

Яшчэ я пачула, з якімі намаганнямі наш касманаўт выконваў маю просьбу — напісаць віншаванні і пажаданні землякам. На гэта ў яго пайшла... гадзіна часу. Гэта і зразумела: то ручка падляціць, то лісток, а то і... ногі! Але які ж малайчына, што напісаў!

А што датычыцца фотаздымка, то я яго, па шчырасці, ужо і не чакала. Бо Алег патлумачыў мне ўсе цяжкасці, пра той жа недахоп часу сказаў. І раптам... О цуд! Па «электронцы» — атрымліваю. Ды яшчэ які здымак!!! Вось такі кадр я і не замаўляла, — усё выстраіў мой аднакласнік. Тут і сцяжкі Беларусі ды Мінскай вобласці са штампам Міжнароднай касмічнай станцыі, і ёлачка з мяккімі ўпрыгажэннямі... А колькі вакол усяго цікавага! І Алег са сваёй фірменнай усмешкай...

Вельмі рада, што ў яго ўсё добра. Голас бадзёры. Калі сказала яму пра гэта, пачула ў адказ смех: маўляў, толькі паабедаў. А мяне ўжо хутка вячэра чакала. Тры гадзіны розніцы ў часе.

Як заўсёды, гэты матэрыял у фармаце Word я дашлю Алегу Навіцкаму па «электронцы». Таму ад імя ўсіх землякоў са старонак «Звязды» шчыра віншую нашага трэцяга беларускага касманаўта і яго калег з надыходным Новым годам! Няхай сустрэча 2013-га стане кранальнай і запамінальнай, святочнай і радаснай, пройдзе ў сяброўскай атмасферы. А мы на Зямлі абавязкова ўздымем бакалы, скажам тост, і не адзін, за цябе, Алег! За твой поспех, за тваё здароўе, за ўдалы палёт і за будучае шчаслівае вяртанне дахаты!

**Святлана АДАМОВІЧ**

■ Звычайныя героі

# «СПАКОЙНА! ІДЗЁМ НА ДАПАМОГУ!»

## ЯК РАТАВАЛІ ЛЮДЗЕЙ НА ВУЛІЦЫ ТАТАРСКАЙ У ГРОДНЕ


Фота Міхаіла ІСАЧАНКІ.

**Выратавальнікі. Разам з начальнікам Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Пятром КОРЖЫКАМ.**

**Да падзей гэтай ночы (гл. «Звязда» за 19 і 20 снежня) большасць гродзенцаў наогул не ведала пра існаванне вуліцы з такой назвай. І сапраўды, гэта зусім невялікі «кавалак» прыватнага жылога сектара, у асноўным драўляных дамоў, так бы мовіць, далёка не першай маладосці. З дарогі, што вядзе да Цэнтральнага рынку, гэтыя будынкі і не відаць, бо іх засланяе шматпавярхоўка, якая адносіцца ўжо да вуліцы Белуша.**

**Менавіта каля гэтага будынка здарылася аварыя на магістральнай цеплатрасе. Дзясяткі тон вады (і не халоднай, а кіпеню, тэмпература якога дасягала 90 градусаў) рынуліся ў нізіну, на прысядзібныя ўчасткі і хаты па вуліцы Татарскай.**

Спачатку там працавалі 20 работнікаў першай і другой пажарных аварыйна-выратавальных часцей Гродзенскага гарадскога аддзела па надзвычайных сітуацыях, «азотаўскай» часці, вадалазнай службы, а неўзабаве падключыліся і іншыя. Адзін з удзельнікаў эвакуацыі жыхароў вуліцы Татарскай, **начальнік каравула аварыйна-выратавальнай часці №2, старшы лейтэнант Віталь АНІСЬКА** (у яго падраздзяленні служыць **сяржант Павел ЯНУШКЕВІЧ,** які атрымаў моцныя апёкі) расказвае:

— Знаходзіліся на дзяжурстве, якраз быў час адпачынку. І тут паступіў сігнал трывогі з цэнтра аператыўнага кіравання. Менш хвіліны на зборы і хвілін пяць на дарогу, каб даехаць на месца аварыі. Там ужо знаходзіліся два аддзяленні з аварыйна-выратавальнай часці №1, якія на той момант вывелі пяцярых чалавек з двух дамоў. Мы таксама накіраваліся на эвакуацыю пацярпелых. Мароз, навокал шмат пары — нават са спецыяльным пажарным ліхтаром бачнасць практычна нулявая, максімум метр. Людзі крычалі, прасілі аб дапамозе, і мы ішлі на іх галасы. Вада прыбывала вельмі моцна: першых людзей выносілі яшчэ з ложкаў, а потым забіралі з падаконнікаў, газавай пліты, даху, слупоў... Каб яны не нарабілі глупства, не ўзнікла жадання саскочыць уніз, мы ўвесь час размаўлялі з імі, казалі: «Спакойна, мы ідзём да вас! Мы вам дапаможам!»

Віталь Аніська толькі сёлета каля пяцідзесяці разоў выязджаў на пажары, іншыя надзвычайныя сітуацыі — напрыклад, калі прыватныя дамы падтапляліся паводкай. Аднак дзейнічаць у кіпені яму, ды і, пэўна, іншым, нават куды больш вопытным калегам, яшчэ не даводзілася. Не гаворачы ўжо пра Паўла Янушкевіча, Станіслава Кончыка і іншых маладых выратавальнікаў.


Фота з сямейнага архіва.

**Павел ЯНУШКЕВІЧ з жонкай ІРЫНАЙ.**

— Што датычыцца гэтай аварыі... Тут вада нікуды не знікала, а збіралася менавіта там, дзе знаходзіліся жылыя дамы, — кажа **намеснік начальніка Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей ЛЯВОНАЎ.** — Утварылася нешта падобнае на басейн з кіпенем. А спецыяльных сродкаў аховы асабовага складу, каб знаходзіцца ў вадзе, тэмпература якой каля 90 градусаў, няма. Тым не менш ніхто ў сувязі з неардынарнай сітуацыяй не задаваў пытанняў, ісці ў гэты кіпень ці не.

У месцах падмывання грунту глыбіня вадзянога патоку дасягала амаль двух метраў, што стала пасткай для пяці аўтамабіляў, а ў асноўным вада стаяла вышэй за калена. Нават калі ахоўны касцюм вытрымліваў тэмпературу вады, то існавала пагроза за нешта зачапіцца і парваць яго.

— Былі такія думкі? — цікаўлюся ў **выратавальніка Аляксея ЛАПУШЭКА.**

— Упершыню працаваў у кіпені, аднак пра нейкія наступствы тады не думалася. Навокал гарачая вада, а ў думках — толькі халодны разлік. Ведаеш, што рабіць, — ідзеш і робіш, — адказвае Аляксей. — Дапамагаеш іншым.

**Кіроўца аварыйна-выратавальнай часці № 3 Юрый ЯНУШКЕВІЧ, бацька Паўла:**

*— Паша з дзяцінства да мяне на работу прыбягаў. А цяпер мы з ім працуем хоць і ў розных часцях, але ў адну змену і часта сустракаемся падчас ліквідацыі наступстваў тых ці іншых здарэнняў. Сёння я бачу, што боль яшчэ застаўся, але сын трымаецца малайцом, можна толькі пазайздросціць яго мужнасці.*

Калі сяржант Павел Янушкевіч праваліўся ў яму з вадой, то таварышы забралі ў яго дзіця, якое той нёс на руках, дапамаглі яму падняцца, пасадзілі на выратавальную дошку.

— У адным з дамоў, дзе вада ўжо дасягнула метровага ўзроўню, мы з **Раманам СЦЕПАНЯКОМ** і **Аляксандрам КРАЎЦО**ВЫМ стукам у акно разбудзілі мужчыну. Сказалі, каб апрануўся, узяў дакументы, — і выцягнулі яго адтуль. Добра яшчэ, што ў гэтым будынку высокі фундамент і вада толькі пачынала туды прыбываць. А вось у іншым доме ўжо паплыла канапа, — узгадвае **камандзір аддзялення вадалазна-выратавальнай службы Сяргей ФІЛІПАЎ.**

**Прэс-сакратар Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Наталля ЖЫВАЛЕЎСКАЯ:**

*— Вельмі прыемна, што гродзенцы тэлефанавалі да нас, выказвалі словы ўдзячнасці, цікавіліся, ці патрэбна дапамога пацярпелым, у тым ліку грашыма і медыкаментамі. Людзі высока ацанілі работу выратавальнікаў, і гэта прыдае ім сілы. Зараз жа галоўнае, каб хутчэй папраўіліся Павел Янушкевіч і Станіслаў Кончык. Дарэчы, у прафесію выратавальніка яны прыйшлі невыпадкова: для Паўла вызначальным быў прыклад бацькі, для Станіслава — дзядзькі.*

Каб апрануцца, часу не заставалася — усё вырашалі секунды. У чым людзі былі — у тым іх і выносілі. І ўжо каля аўтамабіляў МНС кіроўцы, іншыя выратавальнікі аддавалі ім свае курткі. Эвакуацыя ажыццяўлялася з дапамогай спецыяльных выратавальных дошак, а там, дзе гэта было немагчыма, людзей выносілі на руках. Тэрмінова заняліся і адной з машын, што правалілася з-за падтаплення грунту, бо была інфармацыя, што ў салоне маглі знаходзіцца людзі. На шчасце, не пацвердзілася.

**Галіна КОНЧЫК, маці Станіслава:**

*— Ён у нас хлопчык добры, спакойны і, разам з тым, мэтанакіраваны. Напрыклад, яшчэ школьнікам стараўся сам зарабіць грошы. Ён лічыць, што ў самай складанай сітуацыі трэба знаходзіць выйсце. Што і даказаў цяпер, калі, не задумваючыся, пайшоў у гэтыя бурлівыя патокі гарачай вады.*

Потым, калі пераканаліся, што ніводнага чалавека ў пацярпелых дамах не засталося, падраздзяленні МНС разам з цывільнымі аварыйнымі брыгадамі яшчэ некалькі гадзін удзельнічалі ў адпампоўванні вады з тэрыторыі вуліцы Татарскай, дзе няма ліўневай каналізацыі, каб прыступіць да рамонту трубаправода. Аб маштабах затаплення сведчыць той факт, што ўвогуле было задзейнічана ажно сем мотапомпаў. Усе службы, якія ўдзельнічалі ў ліквідацыі наступстваў аварыі, працавалі вельмі аператыўна і зладжана.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*г. Гродна*

Леанід ЗАІКА:



# «Шукайце, рызыкуйце і будзьце паспяховымі»

**Пра творчыя падыходы ў эканоміцы наш карэспандэнт гутарыць з вядомым беларускім эканамістам і экспертам Леанідам Заікам.**

**— Леанід Фёдаравіч, а ці магчыма творчасць у такой сферы, як рынкавая эканоміка, дзе пануе тэзіс: «Толькі бізнэс і нічога асабістага». Як вы мяркуеце?**

— Яшчэ як магчыма! Гэта толькі на першы погляд здаецца, што ў эканоміцы ўладараць лічбы сухой статыстыкі і малазразумелыя для шырокай публікі паказчыкі і тэрміны. Праўда, чаму «сухой»? Іншы раз чытаеш эканамічныя справаздачы як бестселер! Вядома, усё (ці амаль усё) у эканоміцы падпарадкавана дзелавой мэтазгоднасці, пошуку аптымальных рашэнняў для дасягнення максімальнай рэнтабельнасці, прыбытковасці, выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі і г.д. Я мог бы доўга прыводзіць факты (не хапіла б плошчы вашага выпуску) удалай рэалізацыі цікавых ідэй, дзякуючы менавіта творчаму падыходу.

Нам, дарэчы, не хапае менавіта творчых знаходак у сферы эканомікі. Хаця б у вядзенні той жа гарадской гаспадаркі, якая пасля наступлення першых моцных маразоў і снегападаў аказалася ў цэнтры ўвагі разлаванай грамадскасці, мясцовых і рэспубліканскіх органаў улады. Прычына банальная: як заўсёды «нечакана» занесла снегам. Гэта стала сур'ёзнай праблемай для выканкамаў. На яе вырашэнне былі кінутыя ўсе наяўныя людскія рэсурсы камунальных службаў, мабілізавана ўся здатная для ачысткі вуліц і дарог тэхніка. Але ўсё роўна гэтыя намаганні не далі хуткага і чаканага эфекту. А чаму б не падысці да вырашэння праблемы творча? Скажам, аб'явіць: тым, хто выйдзе на расчыстку вуліц, будуць плаціць 50-70 тысяч рублёў у гадзіну. Думаю, многія студэнты адклалі б на дзень-другі падручнікі з канспектамі і ўзяліся б за рыдлёўкі. Вось вам і творчы падыход.

**— Цаню ваш гумар. Напярэдадні Новага года асаблівую вынаходлівасць і творчы падыход праяўляюць гаспадары магазінаў, гандлёвых сетак, гіпер- і супермаркетаў. Чаго яны толькі не прыдумваюць, каб прывабіць людзей! Вы згодны?**

— І сапраўды, уладальнікі вялікіх гандлёвых прадпрыемстваў, якія апошнім часам пабудаваны і актыўна ўзводзяцца ў сталіцы, іншых гарадах краіны, — вельмі творчыя і прадпрымальныя асобы. На жаль, з адной папраўкай: пераважна на сваю карысць. Звычайна ў гіпер- і супермаркетах гандлёвая нацэнка на ўсе тавары, якія вырабляюцца за мяжой і ў нашай краіне, складае 20%. Гэта неблагі заробак. Падрыхтоўка да сустрэчы Новага года, святкавання Каляд — «залаты» час для гандлю, магчымасць больш зарабіць на перадсвяточнай ліхаманцы. Можа, таму, што сярод заснавальнікаў вялікіх гандлёвых прадпрыемстваў не так шмат нашых суайчыннікаў?

**— Леанід Фёдаравіч, прабачце, але амаль паўсюдна зіхацяць аб'явы аб акцыях па распродажы прамысловых тавараў і прадуктаў харчавання па зніжаных цэнах. Чым не клопат аб звычайных пакупніках?**

— Я даўно пераканаўся ў тым, што далёка не заўсёды трэба спакушацца на заклікі нашых гандляроў набываць у іх тавары па быццам бы «зніжаных» цэнах. Шматлікія крамы актыўна выкарыстоўваюць, я сказаў бы, нават злоўжываюць папулярнымі словамі «зніжка» і «распродаж». Але гэта практыка вядзення бізнэсу накіравана, хутчэй, на выцісканне грошай з насельніцтва, а не на сапраўдны продаж тавараў з істотным зніжэннем цаны. Гэта асабліва кідаецца ў вочы пасля наведвання замежных еўрапейскіх гіпер- і супермаркетаў, дзе высокія цэны, скажам, на складаную бытавую тэхніку значна «падаюць» напрыканцы года. Там у час калядных «распродажаў» можна набыць тавар напалову танней за яго ранейшы кошт. Вось гэта зніжкі і распродажы. І самае цікавае — яны выгадныя для гандляроў. У нас такога пакуль няма. Завітаў днямі ў краму з мэтай набыць мікрахвалевую печку — калі не са зніжкай, дык у растэрміноўку. Аказваецца, для гэтага трэба прадставіць гарантыйнае пісьмо з месца працы аб тым, што ў выпадку маёй непрацаздольнасці ўстанова выплаціць грошы... Таму і едуць нашы землякі па тавар у Вільнюс ці Варшаву замест таго, каб падтрымаць айчынную эканоміку.




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**— А як вы ўвогуле ахарактарызуеце 2012 год у эканамічным плане?**

— Адназначна сказаць цяжка. Гэты год быў у значнай ступені годам чаканняў і перасцярог. Але на яго пачатку ўсталяваліся аб'ектыўныя прапорцыі ў эканоміцы. Яна стабілізавалася, стала больш рэалістычнай. Вырас валавы ўнутраны прадукт (ВУП), таксама павялічыўся гандлёвы абарот з далёкім і блізкім замежжам, асабліва з Расіяй. Праўда, не абышлося без цікавых нечаканасцяў. Я звярнуў увагу на дзіўныя факты ў знешнегандлёвай статыстыцы. Напрыклад, мы завезлі з Расіі ў восем разоў больш вугалю і ўдвая больш бананаў, якія там не растуць, ва ўсякім разе ў прамысловых маштабах. Яшчэ шмат набылі ў Расіі свініны, хаця, здавалася, у саміх яе дастаткова. Мы туды традыцыйна пастаўляем замарожанае мяса, розныя малочныя вырабы.

**— Над чым варта ў творчым ключы працаваць кіраўнікам нашай эканомікі ў наступным годзе?**

— Над хібамі і пралікамі 2012 года. Сёлета мы прыцягнулі інвестыцый недзе на 12% менш, чым летась. Гэта выклікае заклапочанасць. Не вельмі радуе і тое, што 48% нашага экспарту ў еўрапейскія краіны складаюць нафтапрадукты. Мы аж на 40% павялічылі вытворчасць саляркі. Згодны, гэта цяпер наш вельмі выгадны і канкурэнтаздольны прадукт. Але хацелася б, каб і іншыя тавары беларускіх вытворцаў (скажам, прадпрыемстваў дрэваапрацоўкі, якім апошнім часам надаецца шмат увагі) паступова займалі выгадныя пазіцыі на рынках розных кантынентаў. Увогуле наступны год, лічу, павінен стаць годам творчых падыходаў у рэалізацыі экспартнай палітыкі нашай краіны. Новых ніш яшчэ дастаткова на замежных рынках.

**— Ці ёсць падставы разлічваць на значны ўздым сусветнай эканомікі?**

— Я вельмі не спадзяваўся б на гэта. Рост будзе, але невялікі. Чаму? Гэта тэма асобнай размовы.

**— Як, на ваш погляд, модная ў апошнія гады тэма крызісу будзе прысутнічаць у 2013 годзе на старонках замежных газет, у эфіры радыё і тэлебачання, у прамовах палітыкаў?**

— Я, іншыя беларускія эканамісты, а таксама нашы расійскія калегі не лічаць гэты год і надыходзячы 2013-ы менавіта крызіснымі. Які крызіс, калі ў Беларусі і Расіі назіраецца эканамічны рост, там павялічваецца вытворчасць, расце колькасць індывідуальных прадпрымальнікаў, фіксуецца ўсё больш ўнёсак у эканамічнае развіццё прадпрыемстваў недзяржаўнай формы ўласнасці і г.д? Сёння, як я казаў, варта засяродзіцца на стварэнні новых высокатэхналагічных якасных прадуктаў, новых брэндаў. Але гэта палова справы. У Беларусі мы маглі б пакідаць толькі «інтэлектуальны складнік» новых вырабаў, таксама захаваць у сябе іх канструктарскую і інжынерную распрацоўку, маркетынг і г.д. А вось вытворчую зборку, ды і з часам поўны выпуск нашых вядомых брэндаў (скажам, машынабудавання) паступова перанесці ў краіны іншых кантынентаў. Бліжэй за ўсё да нас Азія — а там нашы партнёры па СНД: Туркменістан, Таджыкістан і Узбекістан. Карацей, трэба размяшчаць вытворчасці там, дзе гэта прынясе нам карысць. Напрыклад, у Лацінскай Амерыцы і Афрыцы можна развіваць сетку прадпрыемстваў па зборцы беларускіх трактароў і аўтамабіляў. Новая стратэгія экспарту можа ажыццяўляцца па некалькіх асноўных вектарах.

**— Мы напрыканцы года заўсёды бываем занадта аптымістычнымі. Чаму?**

— Гэта ўласціва чалавечай натуры. Мы заўсёды спадзяёмся на лепшае ў наступным годзе. І гэта добра. Мяне, як эканаміста, здзівілі факты рэкордных продажаў беларускіх тэлевізараў у Грузію і сельскагаспадарчых машын у Чэхію. Значыць, можам, калі праявім творчую жылку, нестандартны падыход. Таму хачу пажадаць усім айчынным прадпрымальнікам: шукайце, знаходзьце, рызыкуйце і будзьце паспяховымі ў 2013 годзе.

**Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

## Сяргей МАСКЕВІЧ, міністр адукацыі:



**У 2012 годзе было некалькі падзей, вельмі важных для адукацыйнай галіны. І адна з іх — выбары ў парламент краіны. Натуральна, мяне вельмі парадавала, што сярод новых парламентарыяў шмат педагогаў. Мяркую, гэта сведчанне таго, што людзі давяраюць нашаму прафесіяналізму. Таксама ў адыходзячым годзе быў адкрыты сумесны інжынерна-тэхнічны факультэт Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта і Таджыкскага тэхнічнага ўніверсітэта імя акадэміка М.С. Асімі ў Душанбэ, куды ўжо паступілі першыя 150 студэнтаў. Яшчэ адной значнай падзеяй на прасторах СНД стала правядзенне ў Ерэване другога з'езда настаўнікаў краін Садружнасці. Гэта быў сход сапраўдных прафесіяналаў, якія абмяркоўвалі сумесныя кірункі развіцця нацыянальных сістэм адукацыі. Да таго ж на з'ездзе было прынята вельмі важнае для Беларусі рашэнне па адкрыцці ў СНД Сеткавага каледжа, паколькі яго базавай арганізацыяй быў прызначаны наш Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі.**

**Для мяне асабіста гэты год запомніцца проста бліскучым выступленнем беларускіх школьнікаў на міжнародных школьных алімпіядах — столькі ўзнагарод мы яшчэ ніколі не заваёўвалі! Вельмі парадавалі і беларускія студэнты-праграмісты, якія ўвайшлі ў сусветную эліту: у фінале чэмпіянату свету па праграмаванні ў Варшаве яны заваявалі сярэбраныя і бронзавыя медалі.**

**Галоўнае, чаго чакаю ад наступнага года, — гэта змяненне стаўлення ў грамадстве да прафесіі педагога. Пакуль што статус настаўніка, на жаль, не адпавядае той высокай місіі, якая на яго ўскладаецца, таму імідж прафесіі педагога — тэма выключнай важнасці для нас на бліжэйшы год...**

# Самыя багатыя — праграмісты,

## самая нізкая зарплата — у сацыяльных работнікаў

**Якія зарплаты атрымлівалі беларусы ў 2012 годзе? Нацыянальны статыстычны камітэт ужо падлічыў. Такім чынам...**

Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата беларусаў у студзені—лістападзе 2012 года склала 3 млн 649,7 тыс. рублёў, у тым ліку ў лістападзе — 4 млн 244,3 тыс. рублёў.

Самая высокая сярэдняя заработная плата ў лістападзе гэтага года была ў работнікаў ІТ-індустрыі — 10 млн 392,5 тыс. рублёў.

Таксама высокая сярэдняя зарплата ў лістападзе была зафіксавана ў работнікаў паветранага транспарту (9 млн 72,3 тыс. рублёў) і на вытворчасці коксу, нафтапрадуктаў і ядзерных матэрыялаў (8 млн 450,4 тыс. рублёў).

Самую нізкую зарплату ў лістападзе атрымалі сацыяльныя работнікі (2 млн 580,5 тыс. рублёў) і работнікі адукацыі (2 млн 968,9 тыс. рублёў).

У прамысловасці сярэдняя заработная плата ў лістападзе склала 4 млн 825,7 тыс. рублёў, на транспарце і ў сувязі — 4 млн 727,6 тыс., у будаўніцтве — 5 млн 373,6 тыс., у сельскай гаспадарцы, паляванні і лясной гаспадарцы — 3 млн 231,4 тыс. рублёў, у галіне аховы здароўя — 3 млн 253,7 тыс. рублёў. Пры гэтым сярэдняя заработная плата ўрачоў была роўная 5 млн 329,7 тыс. рублёў, сярэдняга медыцынскага персаналу — 3 млн 170,9 тыс.

Максімальны тэмп росту рэальнай заработнай платы ў студзені—лістападзе 2012 года да ўзроўню студзеня—лістапада 2011-га назіраўся ў сферы рамонту бытавых вырабаў і прадметаў асабістага карыстання (145,5%), на сухапутным транспарце (130,4%). Мінімальны — у сферы архітэктуры, інжынерных паслуг (98,2%), у галіне радыёвяшчання і тэлебачання (101,8%), на водным транспарце (106,6%).

### Самыя багатыя і самыя бедныя рэгіёны

Традыцыйна лідзіруе па ўзроўні сярэдняй заработнай платы ў Беларусі Мінск (5 млн 448,5 тыс. рублёў). Мінімальны сярэдні заробак адзначаецца ў Брэсцкай вобласці (3 млн 770,4 тыс. рублёў).

У Мінскай вобласці гэты паказчык склаў 4 млн 195,6 тыс. рублёў, у Віцебскай — 3 млн 765,2 тыс. рублёў, Гомельскай — 4 млн 062,1 тыс. рублёў, Гродзенскай — 3 млн 836, 1 тыс. рублёў, Магілёўскай — 3 млн 916,8 тыс. рублёў.

Лідарамі сярод рэгіёнаў краіны па росце рэальнай заработнай платы з'яўляюцца Гомельская і Мінская вобласці.

### Яшчэ раз пра «мінімалку» і тарыфную стаўку першага разраду

З 1 студзеня гэтага года месячная мінімальная заработная плата (МЗП) была ўстаноўлена на ўзроўні 1 млн рублёў, гадзінная мінімальная заработная плата — 5 тыс. рублёў. З улікам індэксацыі МЗП за лістапад гэтага года склала 1 млн 109 тыс. 120 рублёў, гадзінная мінімальная заработная плата — 6 тыс. 580 рублёў.

З 1 студзеня 2013 года мінімальная зарплата ў Беларусі будзе раўняцца 1 млн 395 тыс. рублёў. Памер гадзіннай мінімальнай заработнай платы з 1 студзеня 2013 года — 8 тыс. 340 рублёў.

Тарыфная стаўка першага разраду ў 2012 годзе пераглядалася тройчы. У апошні раз гэта адбылося 1 верасня, калі яна была павышана з 210 тыс. рублёў да 225 тыс.

На пасяджэнні Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях, якое адбылося 21 снежня, міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна заявіла, што зноў разглядаецца пытанне павелічэння тарыфнай стаўкі першага разраду. Але канкрэтныя тэрміны яе павышэння яшчэ не вызначаны.

**Святлана БУСЬКО.**

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:

## «Дзеці, якія засталіся без бацькоў, патрабуюць асаблівай увагі дзяржавы і выхавальнікаў»

**Задача дзяржавы і выхавальнікаў — максімальна акружыць увагай дзяцей, якія засталіся без бацькоў, заявіў прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч, наведваючы дзіцячы дом № 6 Мінска ў час дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці», перадае БЕЛТА.**

Міхаіл Мясніковіч агледзеў памяшканні, у якіх жывуць і навучаюцца дзеці, паразмаўляў з выхаванцамі дзіцячага дома і павіншаваў іх з надыходзячымі святамі, абмеркаваў з кіраўніцтвам установы актуальныя пытанні адносна пражывання дзяцей, іх усынаўлення і ўдачарэння, пацікавіўся, як праходзіць адаптацыя выхаванцаў дзіцячага дома пасля таго, як яны пакідаюць яго сцены. Прэм'ер-міністр прыняў удзел у святочнай праграме, падрыхтаванай выхаванцамі і персаналам установы. Міхаіл Мясніковіч перадаў дзіцячаму дому тэлевізар, спартыўныя мячы, салодкія падарункі.

У размове з прэсай, прэм'ер-міністр звярнуў увагу на тое, што колькасць дзяцей у Беларусі расце. Гэта вынік сацыяльнай палітыкі, якую праводзіць дзяржава, упэўнены Міхаіл Мясніковіч. Сем'ям, якія маюць дзяцей, асабліва шматдзетным, удзяляецца значная ўвага. Разам з тым асаблівая падтрымка аказваецца дзецям, якія засталіся без бацькоў і без апекі бацькоў. Такіх дзяцей цяпер у рэспубліцы 24 тыс. Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што ўрад імкнецца быць у курсе ўсіх праблем, якія суправаджаюць нядобранадзейныя сем'і, дзяцей, якія засталіся без бацькоў, без апекі бацькоў. Адпаведныя даручэнні дадзены кіраўнікам дзяржавы і замацаваны ў беларускім заканадаўстве. «Пры гэтым тут патрэбны не фармальны падыход, тут патрэбна душа», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

«Задача дзяржавы і выхавальнікаў — максімальна акружыць увагай дзяцей, якія апынуліся ў няпростай сітуацыі», — падкрэсліў прэм'ер-міністр. Ён выказаў падзяку ўсім, хто працуе на ўстановах, дзе выхоўваюцца дзеці, якія засталіся без бацькоў. «Зразумела, што бацькоў не заменіш, але хоць неяк палепшыць тую рэальнасць, у якой апынуліся такія дзеткі, проста неабходна», — канстатаваў Міхаіл Мясніковіч.







# ГАЛОЎНЫ ЦУД — ВЯРНУЦЦА ДАДОМУ

**Свята хацелася падарыць усім, таму супрацоўнікі «Звязды» накіраваліся ў Бараўляны да тых, хто мае найбольшую патрэбу ў навагодніх дзівосах, — у сацыяльны цэнтр для дзетак, чыіх бацькоў часова пазбавілі правоў. Аднак атрымалася так, што не толькі мы ладзілі для малых салодкія сталы і конкурсы — дзеткі таксама віншавалі нас, падрыхтаваўшы святочнае навагодняе прадстаўленне.**

Сацыяльны цэнтр сустрэў нас шчырымі ўсмешкамі, шматлікімі яркімі ўпрыгажэннямі і добрым настроем. Дарэчы, пра гэтае месца неаднаразова даводзілася чуць, што яно «адкрытае» для ўсіх: сюды можа завітаць той, хто хоча дапамагчы. І мы сапраўды былі тут не адны. Са сваімі падарункамі прыехалі шэфы — вайскоўцы, студэнты тэатральнага факультэта Акадэміі мастацтва і зладзілі на сцэне яшчэ адну добрую казку. Заходзілі і іншыя госці.

Адметна, што ўсе маленькія (чалавек дваццаць) былі апрануты ў адмысловыя касцюмы — лісак, зайчыкаў, сняжынак. Мы праводзілі з імі розныя конкурсы — стваралі тэатр з рук, гулялі ў ката і мышэй. Напачатку малыя, натуральна, сарамеліся, аднак пасля ўсе ажывіліся, актыўна ўдзельнічалі. Тое ж было і са старэйшымі дзецьмі: падчас добрай гульні і сяброўскіх зносін сарамлівасць знікае.

Мы гулялі з дзеткамі і разумелі: тое, што найбольш ім патрэбна, — гэта зносіны да любові. Дзіцячае сэрца гатова адтаяць у любы момант — толькі працягні да яго руку...

Міжволі ўзнікала вечнае пытанне: «Чаму?» — чаму гэтыя маленькія дзяўчынкі і хлопчыкі не маюць сем'яў? Чаму іх родныя бацькі не ў стане быць са сваімі дзецьмі? Дзе ўсе тыя адзінокія людзі, што маглі б стаць ім блізкімі? Мы віншавалі дзетак і прапаноўвалі загадаць самыя запаветныя жаданні, казалі, што яны абавязкова здзейсняцца, хоць і не адразу. Пэўна, усе яны загадалі мець сям'ю — ранейшую, альбо новую, прыемную, але сваю.

«Дзеці знаходзяцца тут да 6 месяцаў, пакуль вядзецца праца з бацькамі. Калі ўжо ў нас не атрымліваецца, то ёсць яшчэ камісія, дзе працуем не толькі мы, але і наркологі, міліцыя і іншыя. Калі не можам паўплываць на бацькоў, то ідзём у суд на пазбаўленне бацькоўскіх правоў», — расказвае Ала Старасценка, дырэктар Мінскага раённага сацыяльна-педагагічнага цэнтра. Па яе словах, за гэты год 59% дзяцей вярнуліся ў сем'і. Да некаторых, дарэчы, пастаянна прыходзяць сваякі — цёткі і дзядзькі. Жывуць у прытулку дзеці ад 3 да 16 гадоў. Яны вучацца ў школе, таму добра сацыялізуюцца. Толькі тыя, хто яшчэ не ходзіць у школу, навучаюцца ў самім прытулку.

❑❑❑

*«Звязда» вельмі ўдзячная тым, хто дапамог нам арганізаваць акцыю: Анатолю Статкевічу-Чабаганаву, пісьменніку, даследчыку беларускай культуры, Алегу Кажухару, а таксама фабрыцы «Камунарка».*

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ, Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**



Фотаздымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.



# ТВАРЫЦЬ ДАБРО ТАК ПРОСТА...



Ларыса ІВАШКЕВІЧ.

**Адзін малады мужчына захацеў адзначыць свой трыццаты дзень нараджэння так, каб надоўга запомнілася, а менавіта — у кампаніі «зорак» айчыннага шоу-бізнэсу, якіх ён добра ведаў. Свята павінна было прайсці з размахам — на поўную катушку. Аднак нечакана ўсё пачало зрывацца: госці сталі адмаўляцца, праграма таксама не ладзілася. І тады ён вырашыў адзначыць сваё свята не атрымліваючы, а... аддаючы. Разам з сябрамі, у якіх ён з'яўляецца трэнерам па бодзібілдынгу, Дзяніс Касцянаў накіраваўся ў дабрачынны фонд, а адтуль — у дзіцячы дом.**

Мужчыны проста прыйшлі ў фонд «Дотык да жыцця» і спыталі, чым можна дапамагчы. Ім прапанавалі Івянецкі дзіцячы дом. Яны патэлефанавалі туды, даведаліся, у чым установа мае патрэбу, і прыехалі да дзяцей, ды не проста так, а на сваіх матацыклах. Пагулялі з малымі і нават пакаталі іх на «байках». З таго часу Дзяніс Касцянаў называе той дзень «Самым радасным днём народзінаў».

— Я даўно марыў пра тое, каб заняцца дабрачыннасцю, аднак гэта заўсёды адкладваеш на пасля, бо спачатку — праца, бізнэс, сям'я. Лічу, што кожны чалавек павінен хоць раз у жыцці наведаць інтэрнат для дзяцей-інвалідаў. Пачынаеш пасля гэтага многае пераасэнсоўваць, больш спакойна ставішся да сваіх праблем — калі маеш вочы, ногі, рукі, ты ўжо шчаслівы.

Напярэдадні Новага года Дзяніс Касцянаў і яго каманда разам з фондам «Дотык да жыцця» вырашылі арганізаваць «ёлкі дабрыні»: з'ездзіць у пэўны інтэрнат, папрасіць, каб дзеці напісалі лісты з пажаданнямі і развесіць іх на спецыяльных ёлачках, усталяваных у буйных супермаркетах. Любы наведвальнік мог зняць ліст, прачытаць, пайсці і набыць тое, што папрасіла дзіця.

**Заснавальнік фонду «Дотык да жыцця» Ларыса ІВАШКЕВІЧ** упэўнена, што дабрачыннасць пачынаецца не з фінансаў, а з душэўнай цеплыні. Яна лічыць, што абсалютна ў кожнага чалавека ёсць жаданне дапамагаць — і гэта нармальнае жаданне. Справа толькі ў тым, рэалізуе яго чалавек або адкладвае на пасля.

Кіраўнік фонду адзначае, што ў дабра шмат твараў, а дабрачыннасцю займаюцца як маленькія, так і пажылыя. Людзі, якія хочуць дапамагчы, прыходзяць у фонд сем'ямі. Яна ўзгадвае, як адзін хлопчык цягнуў сюды свой «велік» — пэўна, ён з яго ўжо вырас. А аднойчы ў фонд на дабрачынную лінію цэлы дзень спрабавала датэлефанавацца бабуля, але ніяк не магла, бо набірала няправільную лічбу. І пакуль яна высвятляла, у чым праблема, сама прыехала ў фонд з канкрэтнай дапамогай. Ларыса Івашкевіч кажа, што беларусы — вельмі добры народ.



Дзяніс КАСЦЯНАЎ (у цэнтры) на ранішніку ў Івянецкім дзіцячым доме.

І яна ўпэўнена, што не толькі замежнікі могуць забіраць «складаных» дзяцей у сем'і, даваць ім будучыню, але і беларусы.

— Калі сённяшняе пакаленне будзе імкнуцца займацца дабрачыннасцю, рабіць усё шчыра, любіць людзей, то наступнае пакаленне стане нашым водгукам, — кажа яна. — Тое, што ты робіш сёння, заўтра прадоўжыцца, магчыма, нават з лепшым эфектам.

Звычайна прынята напярэдадні Новага года разлічвацца з даўгамі, ставіць кропкі, каб першага студзеня пачаць жыццё з чыстага ліста. Аднак... нічога, часцей за ўсё, не атрымліваецца. Ларыса Івашкевіч упэўнена: усё добрае, што мы адкладваем на потым, трэба рабіць адразу, не чакаючы 1 студзеня, будучага панядзелка і г.д.

— Самая галоўная задача кожнага ў жыцці — гэта не тармазіць, а паспець зрабіць штосьці, не чакаючы, пакуль для гэтага складуцца пэўныя спрыяльныя абставіны.

На працоўным стале Ларысы стаіць прыгожы фотаздымак з пяццю любімымі мужчынамі — мужам і чатырма сынамі (яна ўдакладніла, што сыны ўжо прывялі ў дом чатырох выдатных дзяўчат). Убачыўшы фота, падумала: цікава, што было спярша? Дабрыня, якую яна бескарысна аддавала іншым, дапамагла ёй займець такую выдатную сям'ю, або, наадварот, моцная любоў пяці родных мужчын перапоўніла яе і натхніла дзяліцца ёю з тымі, каму так яе не хапае?

Давайце не будзем наіўна спадзявацца, што ў Новым годзе дзівосы зваляцца на нас з неба. Спачатку трэба самому некага ашчасліваць гэтымі дзівосамі...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

*8 902 101 45 45 — гарачая лінія фонду. Кошт аднаго званка — 10 300 беларускіх рублёў. Патэлефанаваўшы, вы зможаце некаму дапамагчы.*



Яраслаў Ліневіч, галоўны архітэктар «Мінскграда».

# ДАРАГАЯ МАЯ СТАЛІЦА

**Які наш Мінск, ці ёсць у яго свае ўнікальныя асаблівасці, ці камфортны ён для пражывання, ці дружалюбны, як будзе развівацца далей? Мы маем унікальную магчымасць акінуць нашу сталіцу прафесійным позіркам чалавека, які служыць ёй ужо больш за сорак гадоў (з 1971-га) які бачыць гэты горад як на далоні і адчувае кожны яго куточак. Сёння наш госць — галоўны архітэктар «Мінскграда» Яраслаў ЛІНЕВІЧ.**

## Як Мінск трапіў у «Сусветную энцыклапедыю архітэктуры»

— У Мінску вельмі шмат рукатворнага, — распавядае Яраслаў Львовіч. — Асабліва многа было зроблена ў пасляваенны перыяд. Мінск размяшчаецца на Мінскім узвышшы, і ўсе рэкі цякуць ад яго. Тым не менш, дзякуючы задуме архітэктараў у горадзе з'явілася два водна-зялёныя паўкольцы: Сляпянская (на поўначы) і Лошыцкая (на поўдні) водныя сістэмы.

Сляпянская водная сістэма перасякае практычна ўвесь Мінск ад Драздоўскага вадасховішча да Чыжоўкі (яе даўжыня 22 км!). Яе спраектавалі для стварэння мікраклімату і зон адпачынку ў жылых масівах сталіцы, і менавіта дзякуючы ёй многія мінчане ўжо прывыклі да журчання вады, эфектных вадаспадаў, рыбакоў і качак з чайкамі.

Гэты праект, распрацаваны больш за 30 гадоў таму, стаў лепшым у СССР і трапіў у «Сусветную энцыклапедыю архітэктуры».

На жаль, другое, Лошыцкае водна-зялёнае паўкольца, прызначанае для жыхароў паўднёвага захаду горада, было пабудавана толькі часткова. Нам трэба рэалізаваць усе задачы, звязаныя з Лошыцкай воднай сістэмай. Тады горад атрымае поўнае кампазіцыйнае завяршэнне, сваю адметнасць.

## Гмахаў пабольшае

У любым горадзе заўсёды вылучаюцца вышынныя дамінанты — будынкі, вышыня якіх у 2-2,5 раза большая за навакольныя забудовы. Сёння ў Мінску налічваецца больш за 400 такіх будынкаў, з іх каля 250 — у 16 і больш паверхаў. Вышынныя дамы пабудаваны як на галоўных праспектах і плошчах, так і ў глыбіні мікрараёнаў.

У хуткім часе павысіцца міжнародная значнасць паўднёвага ўезду ў сталіцу (з боку вузла перасячэння транс'еўрапейскіх калідораў). У сувязі з гэтым будзе развівацца кампазіцыя забудовы праспекта (працяг вул. Кіжаватава) на тэрыторыі сталічнага дзелавога цэнтра Мінск-Сіці. Там плануецца група вышынных будынкаў максімальнай паверхавасці. Тое ж самае запланавана і на праспекце Пераможцаў у паўночна-ўсходняй частцы горада, на тэрыторыі сталічнага комплексу «Маяк Мінска». Будаўніцтва гмахаў таксама не выключаецца на тэрыторыях усіх жылых і вытворчых раёнаў горада.

Разам з тым, Яраслаў Ліневіч адзначае, што не заўсёды вышынным будынкам варта ўрывацца ў існуючыя кварталы. Калі вакол пяціпавярховыя забудовы, а ўнутры іх вырастае панэльны гмах — гэта не вельмі добра.

— Якасць гарадскога асяроддзя павінна быць канкурэнтаздольнай з іншымі гарадамі, іншымі краінамі, — сцвярджае галоўны архітэктар «Мінскграда». — Тады сюды пойдзе інвестар. Сёння ў нас часам інвестары дыктуюць свае ўмовы, а мы здаём пазіцыі і... не вытрымліваем стандарты горадабудаўнічай палітыкі. Між тым, нашаму гораду трэба вызначыцца, якія інвестары яму патрэбны. Калі гэта сфера абслугоўвання — тады «так». А вытворчыя прадпрыемствы трэба адпраўляць у малыя гарады, дзе насельніцтву не хапае занятасці.



Сталіца ў 1970-х.

Акрамя таго, сталічны горад, на думку нашага суразмоўцы, прадугледжвае міжнародны ўзровень, узровень высокіх тэхналогій. Таму пляцоўкі трэба прытрымліваць для аб'ектаў міжнароднага ўзроўню: выставачных цэнтраў, залаў кангрэсаў і інш.

## Аўтамабілі наступаюць

Мінск аказаўся не гатовым да ўсеагульнай аўтамабілізацыі. У 1982 годзе, паводле Генеральнага плана сталіцы, прадугледжвалася 180-200 машын на тысячу жыхароў. Сёння іх амаль у тры разы больш.

— Каб адрэгуляваць гэтае пытанне, трэба пачаць актыўнае будаўніцтва ўсёй сістэмы вулічна-дарожнай сеткі горада, — сцвярджае Яраслаў Львовіч. — На жаль, сёння першае транспартнае кольца (праходзіць па вул. З. Бядулі, Казлова, Варвашэні, Ерусалімскай, Драздa (пр. Машэрава), Ціміразева, К. Цэткін, Бабруйскай, Ульянаўскай, Першамайскай), якое павінна зняць напружанне з цэнтральнай часткі горада , — яшчэ не закончаны праект. Калі будзе дабудавана першае кольца з усімі развязкамі, яно здыме транспартныя патокі і напружанне з цэнтральнай часткі горада.

Неабходна дабудаваць другое гарадское кольца (вул. Ванеева, Дзяніcаўская, Аэрадромная, пр-ты Жукава і Пушкіна, вул. Арлоўская, Сурганава, Акадэмічная, завулак Казлова і вул. Даўгабродская). Намечана і трэцяе — яно будзе ісці ўздоўж Лошыцкай і Сляпянскай водных сістэм і «падхапляць» перыферыйныя гарадскія раёны.

У планах ёсць і чацвёртае, транзітнае (другая МКАД, у 18 км ад горада), якое звяжа ўсе прыгарадныя раёны і сталіцу. Там павінны быць сканцэнтраваны ўсе лагістычныя аб'екты. Гэтак жа, як і буйныя гіпермаркеты, якія трэба было б выносіць за горад.

Мінскі метрапалітэн у перспектыве будзе складацца з 53 станцый і мець чатыры лініі агульнай працягласцю 72 км. Другая лінія метро ўжо практычна сфарміравана. У комплекснай транспартнай схеме плануецца яе падаўжэнне ад станцыі «Каменная Горка» да «Чырвонага Бору». Не выключаецца магчымасць падаўжэння метро да мікрараёна Шабаны.

Трэцяя лінія звяжа Курасоўшчыну з Зялёным Лугам і пройдзе праз вуліцы Багдановіча, Нямігу, Аэрадромную.

Чацвёртая лінія будзе пракладзена ад Вяснянкі да Чыжоўкі і пройдзе ўздоўж вуліц Пляханава, Уральскай, Платонава, Нававіленскай — усяго 13 станцый і 18 км шляху.

Калі стварыць усе ўмовы для развіцця грамадскага транспарту, тады большая колькасць людзей будзе выкарыстоўваць аўтамабілі толькі для загарадных паездак. На Захадзе, дзе добра працуе грамадскі транспарт, многія так і робяць. Спадзяёмся, і мінскія двары ў будучыні, са зменай санітарных нормаў і будаўніцтвам паркінгаў, пазбавяцца ад наплыву аўтамабіляў.

## Пешаходная зона: не ўсё так проста

У Еўропе тварам горада часта з'яўляюцца пешаходныя вуліцы. На іх, як правіла, пануе прыязная атмасфера, там можна з галавой акунуцца ў жывы паток гарадской культуры.

Але, па словах Яраслава Ліневіча, так атрымалася, што ў Мінску, калі ён пачаў адраджацца пасля вайны, пра гэта не падумалі. І горад у свой час быў спланаваны так, што цяпер пешаходную вуліцу зрабіць няма дзе.

— У нас была спроба стварыць свой «Крашчацік»: мы неяк закрывалі а 18-й гадзіне рух па частцы праспекта ад сквера Янкі Купалы і да плошчы Незалежнасці, — кажа мой суразмоўца. — Але гэта не прыжылося. Патрэбны нармальныя абходы, якіх у нас няма.

Тым не менш, пешаходная зона ў сталіцы ўсё ж павінна з'явіцца — у гістарычнай частцы сталіцы, Верхнім горадзе. Але яе яшчэ трэба зрабіць прывабнай для гараджан і турыстаў. «На такой вуліцы кожныя дзверы павінны несці з сабой нешта асаблівае, — кажа Яраслаў Львовіч. — Павінна быць павышаная канцэнтрацыя музеяў, кавярняў, сувенірных крам. Проста перакрыць вуліцу для ўезду аўтамабіляў — не тое, гэта будзе мёртвая вуліца. Трэба, каб яна «працавала».

## Мінчане да садоў... не дараслі?

У сусветных сталіцах усё больш папулярнымі становяцца разбітыя на дахах сады. Гэта дазваляе ўнесці «трохі прыроды» ў гарадскі пейзаж і дае магчымасць гараджанам правесці хаця б некалькі хвілін увечары на зялёным лужку, адначасова любуючыся гарадской панарамай.

— У нас таксама была такая спроба. Хоць і ўмовы надвор'я не зусім гэтаму спрыяюць, бо тут не цёплы край, — успамінае галоўны архітэктар «Мінскграда». — Усе вышынныя будынкі з мазаічнымі пано ў мікрараёне Усход-1 у савецкі час задумваліся як дамы з садамі на дахах. Нам дапамог Батанічны сад, які падабраў спецыяльныя расліны, што размяшчаліся ў кадках: былі і газоны, і кветкі. Але, на жаль, ужо праз суткі ўсё гэта было знішчана. Магчыма, мінчане не дараслі да гэтага...

Затое мазаічныя пано «Мінск — горад-герой», «Мінск — горад-працаўнік», «Мінск — горад навукі» і «Мінск — горад мастацтва» — на тарцах жылых 16-павярховых будынкаў мікрараёна захаваліся. «Нам удалося спалучыць архітэктуру і мастацтва, — з гонарам гаворыць Яраслаў Львовіч. На жаль, цяпер нас «заядае» паток. Чым небяспечная сённяшняя забудова? Па сутнасці, Мінск — адзіная сталіца ў постсавецкай прасторы, якая забудоўваецца панэльнымі дамамі. Гэта састарэлае тыпавое рашэнне. А трэба жыць не толькі сённяшнім днём — неабходна думаць і аб стратэгіі. Хацелася б, каб кожны раён сталіцы быў індывідуальным».

**Святлана БУСЬКО.**



Сучасны Мінск.

ПЛОШЧА НАШАЙ СТАЛІЦЫ — БОЛЬШ ЗА 300 КВ. КМ. КОЛЬКАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА МІНСКА НА 1 СНЕЖНЯ 2012 Г. СКЛАЛА 1 МЛН 904,3 ТЫС. ЧАЛАВЕК.

**Пакуль у гомельскім парку Фестывальны толькі адна пара закаханых ліхтароў. Стаяць ля берага азярца, мерзнуць і, відаць, разам мараць, што побач з імі з'явяцца іншыя. Напэўна, пачулі гаворку пра тое, што будзе працяг алеі крэатыўных лавак, большасць з якіх таксама прысвечана самаму прыгожаму на свеце пачуццю.**

# ЛІХТАРЫ ЗАКАХАЛІСЯ



Сапраўды, улічваючы недастатковую асветленасць парку, тут можна размясціць «закаханыя» ліхтары, а таксама ўпрыгожыць парк іншымі незвычайнымі малымі архітэктурнымі формамі, лічаць у адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля. Тут якраз падводзяць вынікі абласнога конкурсу эскізных праектаў. Ён праводзіўся ў дзвюх намінацыях: «Скульптура» і «Малыя архітэктурныя формы». Па выніках леташніх аналагічных раённых творчых спаборніцтваў было рэалізавана больш за 20 з 80 пададзеных заявак, расказала начальнік аддзела па справах моладзі Алена Ляшук. Да ўдзелу сёлета, як і летась, былі запрошаны навучэнцы архітэктурных і дызайнерскіх спецыяльнасцяў каледжаў і ВНУ абласнога цэнтра. Яны распрацоўвалі праекты дэкаратыўнай скульптуры або архітэктурныя элементы для размяшчэння ля ўваходу ў раённы загс і на Алеі закаханых, кампазіцыі з элементамі вертыкальнага азелянення, уязныя знакі...



Ідэя стварыць незвычайную зону адпачынку, прысвечаную каханню, належыць студэнтам Гомельскага тэхнічнага ўніверсітэта імя Сухога, які знаходзіцца побач з паркам Фестывальны. Дарэчы, Алея закаханых, на якой паставілі крэатыўныя лаўкі, за некалькі месяцаў, якія прайшлі пасля адкрыцця, стала карыстацца шырокай папулярнасцю ў гамяльчан і гасцей горада над Сожам. Тут з задавальненнем адпачываюць матулі з дзецьмі і маладыя людзі, пенсіянеры і школьнікі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

**На фота: Конкурсныя макеты малых архітэктурных формаў.**

# Лілія АНАНІЧ:

# «КНІГА АДКРЫВАЕ ДЛЯ КОЖНАГА З НАС БЯСКОНЦЫ СВЕТ І РАСКРЫВАЕ САМЫЯ ЛЕПШЫЯ ПАЧУЦЦІ»

**Год кнігі завяршаецца, але з 15 снежня буйныя кніжныя магазіны «Белкнігі» і «Белсаюздруку» запрашаюць на шырокі продаж кніг, сустрэчы з аўтарамі і выдаўцамі. На чарзе, у лютым, — XX Міжнародная кніжная выстава-кірмаш. Ганаровым госцем стане Расія, аднак будуць запрошаны і дэлегацыі з такіх краін, як Кітай і Індыя, з якімі ў нас сёлета завязаліся добрыя выдавецкія стасункі.**
**А падрабязней аб тым, чым жыў сам Год кнігі, расказвае першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія АНАНІЧ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Сёлета выйшла з друку ўнікальная, якой яшчэ не было ў Беларусі, флэш-кніга з прадугледжанай сістэмай пошуку «Рэспубліка Беларусь. Экспартны патэнцыял» на рускай і англійскай мовах. У выданні сабрана ўся эканоміка краіны — паслугі, тавары, прамысловасць і г.д. Што называецца, ад мэблевага гарнітура да трактара. Кніга прадстаўлена двума друкаванымі тамамі і флэш-карткай, на якой размешчана інфармацыя дзевяці тамоў. Дзякуючы вялікай, зробленай у сціслыя тэрміны, працы выдавецтва «Беларуская Эндыклапедыя імя П. Броўкі», мы маем цяпер самы змястоўны інфармацыйны каталог.

Яшчэ адзін прадукт выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі» — фотаальбом Ісака Сербава «Беларусы. 100 гадоў таму». 400 фотаздымкаў засведчылі, якім было жыццё нашых продкаў. Выходзіць з друку і фотаальбом «Беларусь» — досвед пра нашу гісторыю і сучаснасць на рускай, беларускай і англійскай мовах. У серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» выйшлі ў гэтым годзе кнігі, прысвечаныя Я. Купалу, Я. Коласу і М. Танку, шмат іншых.

Год кнігі — гэта не толькі знакавыя кніжныя праекты. Трэба адзначыць, напрыклад, акцыю «Маміна казка» Беларускага саюза жанчын, Міністэрства інфармацыі і Рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда». Выдадзеная ў межах акцыі кніга рускіх і беларускіх народных казак была перададзена ў дамы-інтэрнаты.

А Міжнароднаму конкурсу «Мастацтва кнігі» налета будзе ўжо 10 гадоў. У маі ў Мінску пройдзе чарговае, юбілейнае, пасяджэнне журы. Такое ганаровае права мы атрымалі яшчэ і таму, што стабільна дэманструем высокі ўзровень нацыянальнага кнігавыдання. Па выніках двух папярэдніх гадоў Беларусь двойчы атрымлівала Гран-пры на гэтым прэстыжным конкурсе. У 2010-м — за кнігу «Радзівілы. Альбом партрэтаў XVII-XIX стагоддзяў», у 2011-м — за кнігу Дзмітрыя Струкава «Альбом малюнкаў 1864-1867 гадоў». Думаю, налета мы маем шанцы зноў атрымаць Гран-пры. Хоць трэба заўважыць, што узровень конкурсу вельмі высокі. І шэраг краін прадстаўляе свае знакавыя праекты. Дарэчы, Беларусь пачала вылучацца менавіта стварэннем новых праектаў. У прыватнасці, серыяй «Рарытэты», у межах якой і нарадзіўся шэраг вышэйназваных выданняў, той жа альбом «Беларусы. 100 гадоў таму».

Па традыцыі, мы паказалі нашу беларускую кнігу на міжнародных выставах у Расіі, Літве і Германіі. Акрамя таго, прадставілі Год кнігі ў Кітаі і Індыі. У выніку апошніх сустрэч падпісаны адпаведныя дамоўленасці аб супрацоўніцтве ў галіне кнігавыдання, нараджаюцца новыя ідэі.

**— Як вы ацэньваеце вынікі першага Каляднага кніжнага балю?**

— У гэтага балю быў выдатны, напоўнены глыбокім сэнсам, дэвіз: «Набываючы кнігу, знаходзіш сябе». Хацелася напрыканцы года засведчыць грамадству: кніга адкрывае для кожнага з нас бясконцы свет і раскрывае нашы самыя лепшыя пачуцці. У межах балю прайшоў аўкцыён, на які былі запрошаны не толькі тыя, хто стварае кнігу, але і кіраўнікі розных прадпрыемстваў, дзеячы культуры, прадстаўнікі дыпмісій. Мы і самі не чакалі, што кнігі, замоўленыя на 100-200 тысяч рублёў, у рэшце рэшт разыдуцца за 2-3 мільёны і болей! Кнігі, вядома ж, былі незвычайныя — выдадзеныя ў розныя гады, тыя, якіх няма ўжо ў продажы. Скажам, 7 тамоў «Беларускай Энцыклапедыі імя П. Броўкі». Каб сабраць гэтыя тамы, давялося добра пашукаць іх па розных крамах і нават абласцях. Кошт у выніку дайшоў да 6 мільёнаў рублёў! Было прадстаўлена па адным выданні з Расіі, Украіны і Казахстана. Усяго — 28 лотаў. Першы падобны аўкцыён аказаўся вельмі паспяховым. У выніку амаль 35 мільёнаў рублёў былі пералічаны Гарадзішчанскаму дому-інтэрнату.

**— Беларусь захоўвае статус чытаючай краіны?**

— Дастаткова сказаць, што сёлета выдадзена звыш 10 тысяч кніг агульным тыражом звыш 30 мільёнаў экзэмпляраў... Калі на вышэйшым узроўні абвяшчаецца Год кнігі, калі кіраўнік дзяржавы кажа, што страта кнігі — гэта страта дзяржавы, што кніга падобная на ікону, значыць, цікавасць да кнігавыдання захоўваецца і ўсяляк падтрымліваецца. Кніга ёсць духоўная спадчына беларусаў, гэта наша канкурэнтаздольнасць у інфармацыйным свеце. Нашы карані — у нашай гісторыі кнігавыдання. Мы сёння маем права замаўляць сябе як сусветную сталіцу кнігі. Гэты год быў свайго роду пачаткам падрыхтоўкі да 500-годдзя беларускага кнігавыдання.

**— Ці можна лічыць дасканалай існуючую заканадаўчую базу ў галіне кнігавыдавецтва?**

— Напрыканцы года Саветам Рэспублікі адобраны Закон «Аб выдавецкай справе ў Рэспубліцы Беларусь». У 2009 годзе краіны СНД падпісалі Дэкларацыю аб падтрымцы кнігі, і як паказвае практыка, менавіта Беларусь зрабіла самыя актыўныя крокі ў гэтым кірунку — аб'явіла Год кнігі, прыняла вышэйзгаданы закон. Чакаем прыняцця і яшчэ аднаго важнага дакумента — Указа Прэзідэнта «Аб падтрымцы нацыянальнага кнігавыдання», у якім прадугледжана выданне, вытворчасць і распаўсюджванне сацыяльна значнай кнігі для адукацыі, навукі і культуры без абкладання падаткам, з нулявой стаўкай падатку на дабаўленую вартасць. Такая кніга можа патаннець працэнтаў на 20-30. Гэта будзе прываблівацць і замежных кнігавыдаўцоў, прыцягваць інвестыцыі.

Што да закона, то ён сістэматызуе ўсе складнікі выдавецкага працэсу, юрыдычна замацоўвае статус выдаўцоў, вытворцаў, распаўсюджвальнікаў. Мяркуецца, што Міністэрства інфармацыі будзе весці рэестр усіх удзельнікаў кніжнай вытворчасці і распаўсюджвальнікаў. Зменіцца працэдура ліцэнзавання выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці. Гэта не азначае, праўда, што мы адмовімся, каб выдавец пацвярджаў сваю прафесійную прыдатнасць. Як паказвае практыка, гэта вельмі патрэбна, бо выдавецкай справай не павінны займацца тыя, хто нават мовай не валодае...

Дарэчы, разглядалася сёлета і пытанне выдання сацыяльна значных кніг для камплектавання кніжных фондаў публічных бібліятэк. На спецыяльным пасяджэнні ўрада прынята рашэнне, якое дапаможа больш мэтава фарміраваць дзяржаўны заказ кнігавыдання. Штогод у нас выдаецца звыш 100 сацыяльна значных кніг, у тым ліку серыі «Школьная бібліятэка». Звыш 10 мільярдаў рублёў толькі па лініі нашага міністэрства дзяржава выдаткоўвае на гэтую справу. Прычым сюды не ўваходзіць выданне школьных падручнікаў. Упершыню па даручэнні Прэзідэнта пачалася мэтавая камплектацыя бібліятэк кнігамі сучасных беларускіх, у тым ліку маладых, аўтараў.

**— Наколькі паспяхова электронныя экзэмпляры адваёўваюць месца пад сонцам?**

— У нас сёння ёсць кнігі на электронных носьбітах. Так, выдавецтва «Вышэйшая школа» вельмі актыўна стварае вучэбныя дапаможнікі з выкарыстаннем дадаткаў на дысках, проста выдае на дысках асобныя курсы. На наступны год запланаваны выпуск аўдыякніг сучасных беларускіх аўтараў. Іх творы будуць чытаць знакамітыя артысты. Аўдыякніга сёння запатрабавана і ў школах, і ў бібліятэках. Вядома, мы ўлічваем сусветныя тэндэнцыі... Дарэчы, за апошнія 5 гадоў аб'ёмы выдання кніг скараціліся ў розных краінах на 20-40 працэнтаў. Гэтае пытанне абмяркоўвалася і ў Мінску, падчас VI Міжнароднай канферэнцыі кнігавыдаўцоў Беларусі, Расіі, Украіны і Казахстана. Пакуль усе адзначаюць, што наўрад ці можна гаварыць пра масавы характар вышэйназваных працэсаў. Электроннымі кнігамі карыстаецца ў той жа Расіі не больш за 5-7 працэнтаў грамадства. Тут важна яшчэ вось што. Справа не ў тым, што мы не заўважаем тэхналогіі або няправільна іх укараняем. Варта разумець, што да таго як трапіць на які-небудзь сучасны носьбіт (флэш, дыск, мабільны тэлефон), кніга павінна быць спачатку некім створана. Аднекуль жа яе трэба «пампаваць». І ўсё ж такі сёння грамадства больш прагне чытання кніг у традыцыйным, друкаваным варыянце.

На маю думку, новыя тэндэнцыі павінны ахапіць найперш сферу прапаганды і распаўсюджвання кнігі. Сёння і ў нас развіваецца продаж кніг праз інтэрнэт. У першую чаргу папулярнасцю там карыстаецца, вядома, вучэбная літаратура, бо моладзь з'яўляецца найбольш актыўным інтэрнэт-карыстальнікам. Мы ж не павінны забывацца і на вялікую працу ў галіне абароны аўтарскіх правоў.

**— Што-небудзь будзе мяняцца ў падачы, знешнім афармленні дзіцячай літаратуры, якая крыху інакш выглядае ў замежных вытворцаў?**

— У гэтым годзе мы вельмі сур'ёзную ўвагу звярнулі на дзіцячую кнігу. Чытач сапраўды адчуў, што на дзяржаўным узроўні назіраецца пэўны прабел па часткы выдання дзіцячай кнігі. Гэта было звязана з тым, што выдавецтва «Мастацкая літаратура» не развівала вышэйзгаданы сегмент. У планах на наступны год — цікавыя выданні «Мастацкай літаратуры», выдавецкага дома «Звязда», «Беларускай Энцыклапедыі імя П. Броўкі».

Безумоўна, трэба ўзнімаць дзіцячае кнігавыданне на новы ўзровень, у тым ліку і ў плане афармлення. Мы імкнёмся да гэтага. Спадзяёмся, паспрыяе гэтаму і сёлетняе аб'яднанне паліграфкамбіната імя Я. Коласа і Мінскай фабрыкі каляровага друку. Паліграфкамбінат стаў буйным прадпрыемствам, здольным зрабіць істотныя крокі па ўмацаванні тэхналагічнай базы. Разам з тым, не магу не засведчыць, што нашы замежныя калегі адзначаюць добрую якасць нашай паліграфіі.

**— Вядома, «па службе» вам даводзіцца вельмі многа чытаць і проста адсочваць... А ці ёсць час пачытаць што-небудзь для душы?**

— Ведаеце, давялося браць удзел у мерапрыемствах, прысвечаных вайне 1812 года пад Барысавам. І захацелася перачытаць «Вайну і мір». Чытаецца, вядома ж, зусім інакш, чым у юнацтве. Калі б кожнаму з нас трохі больш свабоднага часу, мяркую, кожны чытаў бы больш. Мне асабіста падабаецца звяртацца да друкаваных выданняў, электронная кніга пакуль не ўвайшла ў маё жыццё. Скажу шчыра: сучасныя дэтэктывы — не маё чытанне... Люблю класіку, гістарычныя раманы.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Таццяна ГВОЗДЗЕВА, намеснік генеральнага дырэктара рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белпошта»:



**— Гэты год для нашага прадпрыемства быў вельмі складаным і ў той жа час прадуктыўным: нараджаліся новыя ідэі, новыя праекты, мы ўкаранялі новыя паслугі, развівалі старыя. Што радуе, у нас вельмі прафесійны, творчы калектыў, мы, можна сказаць, каманда, дзе кожны нацэлены на добры канчатковы вынік. Відаць, таму і ёсць чым ганарыцца: у 2012-м РУП «Белпошта» заняло ганаровае 2-е месца ў сусветным рэйтынгу паштовых службаў па развіцці электронных паслуг, атрымала шэраг сертыфікатаў, у тым ліку міжнароднага ўзроўню, якія пацвярджаюць высокую якасць працы.**

**Для мяне асабіста гэты год таксама быў знамянальным: узначаліла новы, адказны і ў той жа час вельмі цікавы, кірунак работы — камерцыйны...**

**А вольны час, вядома ж, хацелася б праводзіць з сям'ёй, з дзецьмі: мы вельмі любім разам бываць на выставах у Мастацкім музеі, у тэатры оперы і балета.**

## КАДЭЦКІЯ ТРАДЫЦЫІ ВЫХОЎВАЮЦЬ ГОДНАСЦЬ І ГОНАР

**Такое меркаванне выказаў старшыня Мінскага аблвыканкама Барыс Батура ўчора на навагоднім балі ў Мінскім абласным кадэцкім вучылішчы, які прайшоў у ходзе дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці», перадае БЕЛТА.**

«Дзеці, якія прайшлі праз школу кадэцтва, ніколі не здрадзяць дзяржаве і вырастуць дастойнымі грамадзянамі. Кадэцкія традыцыі выхоўваюць у дзецях годнасць і гонар», — адзначыў Барыс Батура, віншуючы кадэтаў з Новым годам. Старшыня Мінаблвыканкама азнаёміўся з матэрыяльна-тэхнічнай базай кадэцкага вучылішча, умовамі для навучання і выхавання, а таксама прысутнічаў на дэманстрацыі кадэтамі навыкаў страявой падрыхтоўкі. У традыцыях дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» ён перадаў Мінскаму абласному кадэцкаму вучылішчу каштоўны падарунак — мікрааўтобус.

Навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці» праводзіцца з 10 снежня 2012 года па 11 студзеня 2013-га ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. У Мінскай вобласці ў ёй будзе задзейнічана больш за 10 тыс. дзяцей.




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

| | Студзень | Люты | Сакавік | Красавік | Май | Чэрвень | Ліпень | Жнівень | Верасень | Кастрычнік | Лістапад | Снежань | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| П | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 29 | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 30 | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 | 2 9 16 23 30 | П |
| А | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 30 | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 | 3 10 17 24 31 | А |
| С | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 | 4 11 18 25 | С |
| Ч | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 | 5 12 19 26 | Ч |
| П | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 | 1 8 15 22 29 | 5 12 19 26 | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 29 | 6 13 20 27 | П |
| С | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 | 2 9 16 23 30 | 6 13 20 27 | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 29 | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 30 | 7 14 21 28 | С |
| Н | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 | 3 10 17 24 31 | 7 14 21 28 | 5 12 19 26 | 2 9 16 23 30 | 7 14 21 28 | 4 11 18 25 | 1 8 15 22 29 | 6 13 20 27 | 3 10 17 24 | 1 8 15 22 29 | Н |

# Праваслаўны каляндар

**Пасхалія..................................(паводле новага стылю)**
**Пачатак масленіцы..............11 сакавіка**
**Пачатак Вялікага посту......18 сакавіка**
**Вербная нядзеля....................28 сакавіка**
**Пасха (Вялікдзень)................5 мая**
**Узнясенне...............................13 чэрвеня**
**Пяцідзясятніца (Троіца).......23 чэрвеня**
**Пачатак Пятровага посту..1 ліпеня**

## Двунадзесятыя непераходныя святы

7 студзеня, панядзелак ............ Раства Хрыстова
19 студзеня, субота................. Хрышчэнне Гасподняе (Вадохрышча)
15 лютага, пятніца.................. Стрэчанне Гасподняе
7 красавіка, нядзеля................. Дабравешчанне Прасвятой Багародзіцы
19 жніўня, панядзелак ............. Праабражэнне Гасподняе
28 жніўня, серада.................... Успенне Прасвятой Багародзіцы
21 верасня, субота................... Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы
27 верасня, пятніца ................. Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга
4 снежня, серада...................... Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы

## Вялікія святы

14 студзеня, панядзелак .................. Абрэзанне Гасподняе і памяць свц. Васілія Вялікага
7 ліпеня, нядзеля .............................. Нараджэнне Іаана Прадцечы
12 ліпеня, пятніца ............................ Святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла
11 верасня, серада ............................ Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы
14 кастрычніка,панядзелак............... Пакроў Прасвятой Багародзіцы

## Галоўныя памятныя даты зямлі Беларускай

11 мая ............................................. Свяціцеля Кірыла Тураўскага
20 мая, панядзелак .......................... Жыровіцкай іконы Божае Маці
5 чэрвеня, серада.............................. Прападобнай Еўфрасінні Полацкай
14 ліпеня, нядзеля ............................ Сабор Беларускіх святых
26 жніўня, панядзелак ..................... Мінскай іконы Божае Маці
2 жніўня і 18 верасня.........................прападобнамучаніка Афанасія, ігумена Брэсцкага

## Шматдзённыя пасты

Вялікі пост.........................................з 18 сакавіка да 4 мая
Пятроў пост .......................................з 1 да 11 ліпеня
Успенскі пост.....................................з 14 жніўня да 27 жніўня
Пост перад Раствам Хрыстовым ..........................................з 28 лістапада да 6 студзеня 2014 года

## Аднадзённыя пасты

Серада і пятніца на працягу ўсяго года, за выключэннем усёедных тыдняў і Каляднага перыяду
Навячэр`е Богаяўлення ........................................... 18 студзеня
Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы...................... 11 верасня
Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга ............................ 27 верасня

## Усёедныя тыдні (па серадах і пятніцах посту няма)

Калядны перыяд ...................................................... з 7 да 17 студзеня
Мытара і фарысея.................................................... з 25 лютага да 2 сакавіка
Сырны (масленічны) ............................................... з 11 да 16 сакавіка
Пасхальны (Светлы)............................................... з 6 да 11 мая
Троіцкі ...................................................................... з 24 да 29 чэрвеня

## Трапеза ў святы

Паводле Царкоўнага статута, у святы Раства Хрыстовага і Богаяўлення, калі яны прыпадаюць на сераду і пятніцу, посту няма. У Навячэр`е Раства Хрыстовага, Навячэр`е Богаяўлення, у святы Уздзвіжання Крыжа Гасподняга і Усекнавення галавы Іаана Прадцечы дазваляецца ежа з алеем. У святы Стрэчання, Праабражэння Гасподняга, Успення, Нараджэння і Пакрова Прасвятой Багародзіцы, Увядзення Яе ў храм, Нараджэння Іаана Прадцечы, апосталаў Пятра і Паўла, Іаана Багаслова, калі яны прыпадаюць на сераду і пятніцу, а таксама ў перыяд ад Пасхі да Троіцы ў сераду і пятніцу дазваляецца рыба.

## Дні асаблівага памінання спачылых

Памінанне ўсіх спачылых, што пацярпелі ў час ганенняў за веру Хрыстову ........................................10 лютага
Субота мясапусная.................................................9 сакавіка
Субота 2-га тыдня Вялікага посту.......................30 сакавіка
Субота 4-га тыдня Вялікага посту.......................13 красавіка
Радаўніца ...............................................................14 мая
Памінанне спачылых воінаў.................................9 мая
Субота Троіцкая ....................................................22 чэрвеня
Субота Дзімітрыеўская.........................................2 лістапада

## Не адпраўляецца вянчанне

Напярэдадні серады і пятніцы ўсяго года (г.зн. па аўторках і чацвяргах)
Напярэдадні нядзельных дзён (г.зн. па суботах)
Напярэдадні двунадзесятых, храмавых і вялікіх святаў
На працягу пастоў Вялікага, Пятровага, Успенскага і посту перад Раством
На працягу Каляднага перыяду (ад 7 да 19 студзеня)
На працягу сырнага тыдня (масленіцы), пачынаючы з Нядзелі мясапуснай і ў Нядзелю сырапусную
На працягу Пасхальнага (Светлага) тыдня
У дні і напярэдадні Усекнавення галавы Іаана Прадцечы — 11 верасня і Уздзвіжання Крыжа Гасподняга — 27 верасня

# Каталіцкі каляндар

1 студзеня ................. Святой Багародзіцы Марыі
6 студзеня ................. Аб'яўленне Пана
13 студзеня ............... Хрост Пана
2 лютага ................... Ахвяраванне Пана
13 лютага ................. Папялец
16 сакавіка ................ Гадавіна асвячэння катэдральнага касцёла ў Мінску
19 сакавіка ................ Святога Юзафа
24 сакавіка ................ Пальмовая нядзеля
28 сакавіка ................ Вялікі чацвер
29 сакавіка ................ Вялікая пятніца
30 сакавіка ................ Вялікая субота
31 сакавіка ................ Вялікдзень
7 красавіка ................ Божай Міласэрнасці
8 красавіка ................ Звеставанне Пана (Перанесена з 25.03)
1 мая ......................... Гадавіна асвячэння катэдральнага касцёла ў Пінску
9 мая ......................... Унебаўшэсце Пана
19 мая ....................... Спасланне Духа Святога
26 мая ....................... Найсвяцейшай Тройцы
30 мая ....................... Цела і Крыві Хрыста
31 мая Адведзіны Найсвяцейшай Панны Марыі
7 чэрвеня ................... Найсвяцейшага Сэрца Езуса
8 чэрвеня ................... Беззаганнага Сэрца Найсвяцейшай Панны Марыі
24 чэрвеня ................. Нараджэнне св. Яна Хрысціцеля
29 чэрвеня ................. Св. Апосталаў Пятра і Паўла
2 ліпеня ...................... Найсвяцейшай Панны Марыі Будслаўскай
6 жніўня ..................... Перамяненне Пана
15 жніўня ................... Унебаўзяцце Найсвяцейшай Панны Марыі
8 верасня ................... Нараджэнне Найсвяцейшай Панны Марыі
14 верасня ................. Узвышэнне Святога Крыжа
29 верасня ................. Святых Арханёлаў
10 кастрычніка.......... Гадавіна асвячэння катэдральнага касцёла ў Віцебску
1 лістапада................ Усіх Святых
2 лістапада .............. Успамін усіх памерлых вернікаў
24 лістапада............. Хрыста, Валадара Сусвету
1 снежня.................... Першая нядзеля Адвэнту
4 снежня.................... Гадавіна асвячэння катэдральнага касцёла ў Гродне
9 снежня.................... Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі
25 снежня.................. Нараджэнне Пана
29 снежня.................. Святой Сям'і

# Лютэранскі каляндар

1 студзеня ................. Новы год, Абразанне і нарачэнне імя Ісуса
6 студзеня ................. Богаяўленне, Эпіфанія
25 студзеня ............... Дзень абарачэння святога апостала Паўла
2 лютага ................... Стрэчанне Гасподняе
13 лютага ................. Папяльцовая серада, пачатак Пакутнага часу
1 сакавіка ................. Сусветны дзень малітвы
24 сакавіка ................ Вербная нядзеля
25 сакавіка ................ Дабравесце
28 сакавіка ................ Вялікі чацвер, Дзень усталявання Прычасця
29 сакавіка ................ Пакутная пятніца
31 сакавіка ................ Вялікдзень, Уваскрэсенне Гасподняе
25 красавіка .............. Дзень евангеліста Марка
10 мая ....................... Узнясенне Гасподняе
19 мая ....................... Пяцідзесятніца, свята сашэсця Святога Духа
26 мая ....................... Тройца, свята Святога Трыадзінства
24 чэрвеня ................. Нараджэнне Іаана Хрысціцеля
25 чэрвеня ................. Дзень Аўгсбургскага веравызнання
29 чэрвеня ................. Дзень святых апосталаў Пятра і Паўла
2 ліпеня ...................... Дзень наведвання Марыяй Елізаветы
28 жніўня ................... Дзень памяці ахвяр палітычных рэпрэсій
21 верасня ................. Дзень апостала і евангеліста Мацвея
29 верасня ................. Дзень архангела Міхаіла і ўсіх анёлаў
6 кастрычніка............ Свята падзякі за ўраджай
18 кастрычніка.......... Дзень евангеліста Лукі
30 кастрычніка.......... Дзень памінання ахвяраў гвалту, вайны і тэрору
31 кастрычніка.......... Дзень Рэфармацыі
20 лістапада............. Дзень пакаяння і малітвы
24 лістапада............. Дзень памінання спачылых. Нядзеля Вечнасці
24 снежня.................. Пярэдадзень Раства Хрыстовага
25 снежня.................. Раство Хрыстова
26 снежня.................. Дзень першапакутніка Стэфана
27 снежня..................Дзень апостала і евангеліста Іаана
28 снежня.................. Дзень нявінна забітых немаўлят
31 снежня.................. Пярэдадзень Новага года

# Іўдзейскія святы і пасты ў 2013 годзе

21 лютага — пост Эстэр напярэдадні свята Пурым

24 лютага — святочны дзень Пурым у памяць выратавання іўдзеяў ад Гамана

25 сакавіка (вечар) да 2 красавіка ўключна — свята Пейсах у памяць Выхаду ізраільцян з Егіпта (28-29, 31 — будныя дні Пейсах)

28 красавіка — памятны дзень Лаг-беоймэр у гонар праведніка рабі Шымона бен Йохай

14 мая (увечар) да 16 мая ўключна — свята Швуойс у памяць Даравання Торы ізраільцянам на Сінаі

25 чэрвеня — пост Шыво-осар-бэтамуз у памяць разбурэння сцяны Іерусаліма вавіланянамі і рымлянамі

15 ліпеня (вечар) да16 ліпеня — пост Тышо-бэоў у памяць разбурэння Храма вавіланянамі і рымлянамі

4 верасня (вечар) да 6 верасня ўключна — свята Рош Гашано, новы год, дзень Суда і Літасці Усемагутнага

8 верасня — пост Гедалія ў памяць забойства праведніка Гедаліі

13 верасня (вечар) — 14 верасня — свята Ём-Кіпур, дзень паста і набажэнства, дзень Усеагульнага Прабачэння

18 верасня (вечар) да 20 верасня ўключна — свята Сукойс у памяць Паходу ізраільцян у пустэльні (22-25 верасня — будныя дні Сукойс)

25 верасня (вечар) да 27 верасня ўключна — святы Шміні-ацэрэс і Сімхас-Тойра, завяршэнне восеньскіх святаў і пачатак новага чытання тыднёвых раздзелаў Торы

27 лістапада (вечар) да 5 снежня ўключна — святочныя дні Ханука ў памяць вызвалення Храма з рук грэкаў і здраднікаў, ачышчэння пасля апаганьвання і новага асвячэння Храма

13 снежня — пост Асаро-бэтэйвес у памяць асады Іерусаліма ворагамі; дзень памяці ўсіх загінулых, чый дзень смерці невядомы

# Мусульманскія святы і знамянальныя даты на 2013 год (1434-1435 год па Хіджрэ)

23 — 24 студзеня (11 — 12 рабі аль аваля) — Дзень нараджэння Прарока Мухамада (Мір яму) (Маўлід ан-Набі)

16 — 17 мая (6 — 7 раджаба) — Дзень шлюбу бацькоў Прарока Мухамада (Мір яму) (ноч Рагаіб)

5 — 6 чэрвеня (26 — 27 раджаба) — Узнясенне Прарока Мухамада (Мір яму) (ноч Мірадж)

23 — 24 чэрвеня (14 —15 шаабана) — Ноч ачышчэння ад грахоў (Лейлят аль-Бараа)

9 ліпеня (1 рамадана) — пачатак мусульманскага посту (Ураза)

3 — 4 жніўня (26 — 27 рамадана) — Ноч Прадвызначэння (Лейлят аль-Кадр)

8 — 10 жніўня (1— 3 шаваля) — Ід-аль-Фітр — Свята разгавення — Ураза-Байрам. Заканчэнне мусульманскага посту (святкаванне 3 дні)

14 кастрычніка (9 зуль-хіджа) — Дзень стаяння на гары Арафат

15 — 18 кастрычніка (10 — 13 зуль-хіджа) — Ід-аль-Адха — Свята ахвярапрынашэння — Курбан-Байрам. Заканчэнне вялікага паломніцтва ў Меку (святкаванне 4 дні)

4 лістапада (1 мухарама) — пачатак новага 1435 года па Хіджрэ

13 лістапада (10 мухарама) — Ашура — дзень памінання пракокаў і пасланнікаў Алаха

Даты календара могуць змяніцца ў залежнасці ад стану месяца.

■ З чаго пачынаецца творчасць



# УСЁ БУДЗЕ ДОБРА!

**Алёна Беланожка, маладая пісьменніца з Магілёва, перад святамі занята разнастайнай творчасцю: робіць калядных козачак для падарункаў, аздабляе сабе народны беларускі строй, варожыць з сяброўкамі і піша адразу дзве кнігі.**

## АХВЯРА ПІСЬМЕННІЦТВУ

Пад святы Алёна зрабіла дзіўны ўчынак — учыніла «самагубства» ў сетцы, без літасці і сумненняў вынішчыла свой блог у «жывым часопісе».

— У кожнага аўтара ёсць пэўная колькасць радкоў і знакаў, якія ён можа напісаць за дзень, — тлумачыць пісьменніца сваю тэорыю. — Калі я пішу на сваёй старонцы альбо кантактую з сябрамі ў інтэрнэце, то гэта замінае мне, адцягвае час, сілы і эмоцыі. Я на гэта скваплівая, бо хачу пісаць кнігі.

У свеце, дзе, падаецца, кожны страшэнна перажывае наконт прапушчаных званкоў і на ўсякі выпадак не адводзіць вочы ад экрана мабільніка, Алёна паводзіць сябе дзіўна. Яна з лёгкасцю адключае ўсе тэлефоны, упарта не рамантуе паламаны тэлевізар і спецыяльна замаўляе абмежаваны трафік замест кругласутачнага доступу ў інтэрнэт. Карацей, рашуча абрывае ўсе сувязі з рэальнай і віртуальнай мітуснёй, каб спакойна аддацца творчасці.

## ЗАКАХАНАЯ Ў СВАІХ ГЕРОЯЎ

У пісьменніцы танюткая пастаць — гэта спадчына ад бацькоў і вынік творчага працэсу, што высмоктвае энергію. «Я шмат ем, але ўсё роўна худзею, калі пішу, — тлумачыць яна. — Закаханасць, гаворачы, лепшая дыета для пахудзення, толькі я закаханая ў свой твор і яго герояў».

— Села пісаць кнігу. Чаму? Чытаць няма чаго, — так весела Беланожка расказвае пра свае творчыя пошукі.

Сама яна пачала захапляцца мовай і літаратурай яшчэ ў школе. Пісала сачыненні, удзельнічала ў алімпіядах і меркавала, што пісаць умеюць усе, толькі не ўсе хочуць. А яна хацела, і ў 19 гадоў стварыла дзіцячы мюзікл. З песень перайшла да вершаў, са сцэнарыяў свят — да прозы, і сёлета ў часопісе «Маладосць» надрукавалі яе аповесць «Чамадан з кракадзілавай скуры». Цяпер яна працуе ў Магілёўскім цэнтры вольнага часу і адпачынку і ў свой асабісты вольны час піша кнігі, малюе, вышывае. Карацей — займаецца разнастайнай творчасцю.

## ГЕНОМ І ВЫЦІРАННЕ ПЫЛУ

Сама яна ўпэўнена, што ўсе людзі нараджаюцца творчымі асобамі. Але трэба быць яшчэ і смелым чалавекам, каб ствараць нешта нowae, захапляцца гэтым і паказваць людзям.

— Творчыя людзі не падзяляюцца на гуманітарыяў і тэхнароў, — лічыць Алёна. — У мяне дзядзька слесар-фрэзероўшчык, шмат гадоў працуе на трактарным заводзе. Дастаткова толькі паслухаць пра тое, як ён выrabляе на станку дэталі, каб упэўніцца: ён вельмі творчы чалавек. Калі ты робіш сваю справу з энтузіязмам, ты — творца.



Прычым творча падыходзіць можна і да праціранне пылу, сцвярджае Беланожка. Маўляў, узяла анучку, стала на табурэтку, зазірнула на верхнюю паліцу шафы: «О божа мой! Я ж сюды дзесяць гадоў не глядзела!» Навяла чысціню, знайшла цікавыя рэчы — і жыццё стала лепшым і прыгажэйшым. Хатнія гаспадыні бяруць сцэнарый на ўзбраенне.

Дарэчы, інтарэсы ў гэтай маладой жанчыны вельмі разнастайныя. Напрыклад, біялогія, генетыка. Апошняя набытая і прачытаная кніга называецца «Геном», — пра тое, як X-храмасома душыць Y-храмасому. «Проста цікава, што ад нас застанецца», — так тлумачыць свой інтарэс Беланожка.

Калі Алёна была школьніцай, маці прынесла ёй кодэкс даоскіх манахаў. З добрай сотні пунктаў яна выбарала для сябе галоўны: «Рабі толькі тое, што даецца табе лягчэй за ўсё, але рабі гэта з усіх сіл». Вось па гэтым прынцыпе яна жыве і стварае. Лягчэй за ўсё для пісьменніцы — пісаць.

## ПАЭТАЎ ТРЭБА КАРМІЦЬ

Адкуль браць творчую энергію ў свеце, дзе амаль кожны скардзіцца на млявасць і абыякавасць да жыцця?

— Трэба спаць, калі стомлены, — раіць Алёна. — Мне таксама добра дапамагаюць доўгія пешыя шпацыры. Аднак увогуле не будзе ніякай карысці, калі чалавек не мае сіл, галодны і хворы. Быць самому ў парадку — з гэтага пачынаецца творчасць.

Яна зусім не падтрымлівае высnову, паводле якой сапраўдны паэт павінен быць бедным і галодным.

— Мне падаецца, калі паэт недакормлены, то ён піша вельмі сумныя рэчы, — працягвае пісьменніца. — Трэба яго карміць, каб творы былі пазітыўныя. І гэта няпраўда, што сыты творца супакойваецца. Калі Бог цябе пацалаваў — будзеш рабіць як міленькі.

Творчаму чалавеку дапамагаюць не толькі нябёсы, але і адсутнасць ляноты.

— Не трэба думаць, што неўзабаве анёлы спусцяцца і ўручаць табе «Оскар», — папярэджвае Алёна. — Так не бывае: калі хочаш дасягнуць вышыняў, трэба выдаткоўваць на гэта сілы і час, шмат працаваць.

## ПА ЦУКАР У БУДУЧЫНЮ

Крэатыўныя ідэі кіруюць гэтым светам, таму менавіта прыдумка, сюжэт — гэта самае галоўнае для пісьменніка. Творчыя ідэі бяруцца адусюль: з міфалогіі і народнай творчасці, з назірання за людзьмі.

— А адзін сюжэт мне сёння прысніўся, — расказвае яна. — Хлопец трапляе на экскурсію ў будучыню, а там забаронены цукар, ім распараджаецца толькі адна фармацэўтычная кампанія. І галоўны герой імкнецца здабыць цукар для дзяўчынкі, але гіне ў змаганнях, а потым з яго кішэні вывальваюцца два саладкія кавалкі, якія ён прыхапіў у кавярні ў яго сучаснасці.

Аматарка фантастыкі і містыкі, яна марыць пра тое, каб пісаць сцэнарыі для кіно, і ўжо робіць для гэтага першыя крокі. Яна абсалютна не камплексуе наконт свайго месца жыхарства — у абласным цэнтры. Пры інтэрнэце, цяперашнім узроўні сродкаў сувязі і транспарту няма ўвогуле розніцы, дзе жыць. Галоўнае, што ты робіш.

## ПАЗІТЫЎНЫ ПАЗІТЫЎ

Алёна лічыць, што на мяжы стагоддзяў час стаў такі жорсткі і столькі гвалту (рэальнага, а не толькі прыдуманага) вылілася на старонкі і экраны, таму трэба пісаць нешта пазітыўнае — напрыклад, сатырычнае.

— Я не прэтэндую на лаўры Ільфа і Пятрова, але цяпер пішу нешта пад працоўнай назвай «Культурная культура», што будзе фельетонам і дэтэктывам адначасова, — анансуе свой твор пісьменніца.

Яе, дарэчы, часам крытыкуюць за «галівудскія» фіналы, але...

— Чытачу трэба пакідаць надзею на добры фінал, — лічыць Алёна. — Так, я за рэалізм, але і ён бывае розны: героя можна пахаваць, а можна ажывіць і вылечыць. Чалавеку патрэбна ўстаноўка, што трэба жыць і змагацца, што ў любым выпадку нябёсы неяк «разрулюць» сітуацыю і ўсё будзе добра.

## ГРОШЫКІ НА ЁЛЦЫ

Алёна зусім не размаўляе пра матэрыяльныя рэчы. Яна проста кажа: «Добра, калі ёсць ежа, ёсць дзе спаць і ў што апрануцца». У нашым грамадстве спажывання і захаплення шопінгам такія высновы падаюцца аскетычнымі і... нечакана свежымі. Аднак на ёлцы ў Беланожкі ўсё ж вісяць грошыкі, нібыта на чароўным дрэўцы — на ўдачу і дабрабыт.

Сябрам яна робіць лялькі — сімпатычных калядных козачак. А сабе на гэты Новы год рыхтуе сімвалічны падарунак — нацыянальны сялянскі строй і шляхецкае жаночае ўбранне.

Творчыя планы ў пісьменніцы, якая працягвае ў перадсвяточныя дні актыўна пісаць, на наступны год вялікія: тры кнігі, сцэнарый фільма і зборнік паэзіі.

— Жадаю ўсім творчага настрою, — падсумоўвае яна. — А таксама па-чалавечы ставіцца адно да аднаго. Астатняе прыкладзецца.

**Пакуль рыхтаваўся нумар, Алёна даслала электроннае паведамленне:**

***«Мне толькі што паведамілі, што я перамагла ў літаратурным конкурсе Саюзнай дзяржавы «Мост дружбы». Добры падарунак пад Новы год — не толькі для мяне, але і для ўсёй Беларусі».***

**Ілона ІВАНОВА**

■ Песню бярыце з сабой

# ГАЮ МОЙ, НЕ КЛІЧ

Лірычная песня «Гаю мой, не кліч» Дзмітрыя Даўгалёва і Уладзіміра Пецюкевіча дакладна адлюстроўвае душэўную драму закаханай асобы. Без таго, каго любіш і кахаеш, навакольны свет перайначваецца: ён страчвае рознакаляровую маляўнічасць і духмяны водар, губляе пяшчотна-ўзвышаную прыцягальнасць. Музыка прасвятляе песенны тэкст, эмацыянальна ўлагоджвае, настройвае на прыўзнятыя перажыванні.

Гэтую песню Дзмітрый Даўгалёў стварыў яшчэ ў студэнцкія гады. З той пары ён напісаў шмат выдатных твораў (кантату «Запаведныя сцяжынкі», араторыю «Зорка Палын», сімфоніі, аркестравыя і камерна-інструментальныя п'есы), паклаў на музыку больш за сотню паэтычных тэкстаў беларускіх і рускіх паэтаў. Многія яго песні ўвайшлі ў рэпертуар прафесійных і самадзейных артыстаў, а такія, як «Балада» і «Рэха жураўлінае», прынеслі да заслужанага поспеху выканаўцаў — Ірыну Дарафеевву і Паліну Смолаву — у конкурснай праграме на «Славянскім базары» ў Віцебску.

Песня «Гаю мой, не кліч» увайшла ў шэраг лепшых вакальных твораў апошніх дзесяцігоддзяў і займае трывалае месца сярод іх. Яе першы выканаўца — заслужаны артыст Беларусі Валерый Дайнека — пачуццёва выразна перадае юнацкі сум і боль па каханай, але нязгасную веру на шчаслівае спраўджванне трапяткіх спадзяванняў.

## Гаю мой, не кліч

***Верш Уладзіміра Пецюкевіча. Музыка Дзмітрыя Даўгалёва.***

*Гаю мой, не кліч пад каліны цвет*
*Да крынічных вод, светлых, як вясна:*
*Там яе няма — паляцела ў свет,*
*Наша рэчанька высахла да дна*.*

*Палялела ў свет, русакосая,*
*Стан рабінавы, вочы — сінь азёр.*
*Не спяе ўжо мне мілым голасам*
*Пра дзівосны край у зіхценні зор.*

*Гаю мой, не кліч на шчаслівы смех —*
*Касавіцаю весела ў лугах:*
*Там яе няма — палялела ў свет,*
*Наш мядовы луг палыном прапах.*

*Гаю мой, не кліч пад каліны цвет*
*Да крынічных вод, светлых, як вясна:*
*Там яе няма — палялела ў свет,*
*Наша рэчанька высахла да дна.*

* *Апошнія два радкі кожнай страфы спяваюцца двойчы.*

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН**




## Брэсцкі мастак-эмальер Мікалай КУЗЬМІЧ, які ў канцы 90-х аднавіў нацыянальную святыню — крыж Еўфрасінні Полацкай:



**— Увосень я ўдзельнічаў у другой Міжнароднай біенале эмалі «Сонца для ўсіх», які арганізавалі Саюз мастакоў Расіі, Дзяржаўны Эрмітаж і Міжнародная арганізацыя эмальераў. Сваё мастацтва на выставе прадставілі больш за 70 майстроў з Расіі, Германіі, Японіі, Галандыі, іншых краін. Там атрымаў трэцюю прэмію (першая прэмія не прысуджалася).**

**А літаральна днямі я сам уручаў узнагароду, не зусім звычайную. Грамадскі ордэн «За вернасць Бацькаўшчыне» атрымаў майстар з вёскі Стойлы Пружанскага раёна Мікалай Тарасюк. На замову грамадскай арганізацыі я зрабіў васьміканечную бронзавую зорку — узнагароду, якая больш не мае аналагаў і існуе ў адным экзэмпляры.**

**Планаў на наступны год шмат. Спадзяюся, будуць выставы. Чакаю на стажыроўку маладых пікерскіх мастакоў.**

**У новым годзе зычу ўсім творчага натхнення, душэўнай раўнавагі, любові і прыгажосці!**

Главное управление
Министерства финансов РБ
по Минской области
отдел по ценным бумагам
**ЗАВЕРЯЮ**
Начальник отдела
__________В.В. Главинская
28 декабря 2012 г.

**УТВЕРЖДЕНО**
Общим собранием акционеров
ОАО «Черметремонт»
18.12.2012 (Протокол № 4/2012)

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ АКЦИЙ

## Открытого акционерного общества «Черметремонт» (ОАО «Черметремонт»)

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на белорусском и русском языках):**

На белорусском языке:
полное – Адкрытае акцыянернае таварыства «Чарметрамонт»;
сокращенное – ААТ «Чарметрамонт».
На русском языке:
полное – Открытое акционерное общество «Черметремонт»;
сокращенное – ОАО «Черметремонт».

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail):**

Место нахождения: 223017, Республика Беларусь, Минский район, п. Гатово;
Телефон: + 375 17 503-42-27;
Факс: + 375 17 294-79-41;
Электронный адрес (e-mail): chermetremont@yandex.ru;
Официальный веб-сайт в сети Интернет: www.chermetremont.by.

**3. Основные виды деятельности эмитента (согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь ОКРБ 005-2006 «Виды экономической деятельности»):**

| Код | Наименование |
|---|---|
| 29142 | производство общемашиностроительных узлов и деталей |
| 29432 | производство кузнечно-прессового оборудования |
| 29436 | производство прочих станков и технологической оснастки |
| 29511 | производство металлургического оборудования |
| 29519 | монтаж, наладка, ремонт и техническое обслуживание металлургического оборудования |

**4. Номера расчетного и (или) валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи акций, наименование обслуживающего банка:**

В долларах США:
Счет №3012104774056.
Банк получатель: ОАО «БПС-Сбербанк» (Региональная дирекция №700 ОАО «БПС-Сбербанк»).
SWIFT код: BPSBBY2X.
БИК: 153001369.
УНП: 100219673.
Адрес банка (Региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк»): 220071, Республика Беларусь, г. Минск, пр. Машерова, 80.
Банк-корреспондент: JPMorgan Chase Bank N.A., New York, USA.
Корсчет №899579981.
SWIFT код: CHASUS33.

**5. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном пунктом 8 Инструкции о порядке представления и публикации участниками рынка ценных бумаг отчетности и иной информации, утвержденной постановлением Министерства финансов Республики Беларусь от 21 декабря 2010 г. №157 «О некоторых вопросах представления и публикации участниками рынка ценных бумаг отчетности и иной информации» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2011 г., № 12, 8/23164), информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации эмитента либо о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве), о внесенных изменениях в проспект эмиссии:** газета «Звязда».

Сроки публикации:
- бухгалтерской отчетности эмитента – до 31 марта года, следующего за отчетным;
- информации о принятом решении о реорганизации или ликвидации эмитента либо о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве), о внесенных изменениях в проспект эмиссии – не позднее семи дней со дня наступления события.

**6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента, его место нахождения, дата, номер государственной регистрации и наименование органа, его зарегистрировавшего, номер специального разрешения (лицензии) на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, срок действия специального разрешения (лицензии):**

Наименование депозитария: Инвестиционное частное унитарное предприятие «Совмедиа» (далее – депозитарий).
Место нахождения депозитария: 220036, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Северный, д. 13, корп. 2, каб. 19.
Депозитарий зарегистрирован решением Минского городского исполнительного комитета от 20.06.2000 №695, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №100893381.
Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам №02200/5200-124-1125 выдано Министерством финансов Республики Беларусь, действительно до 22 августа 2022 г.

**7. Права и обязанности акционеров:**

7.1. Акционеры эмитента вправе:
- участвовать в общем собрании акционеров с правом голоса по вопросам, относящимся к компетенции общего собрания акционеров;
- получать часть прибыли эмитента в виде дивидендов;
- получать в случае ликвидации эмитента часть имущества, оставшегося после расчетов с кредиторами, или его стоимость;
- получать информацию о деятельности эмитента и знакомиться с его документацией в объеме и порядке, определенными пунктом 87 устава эмитента;
- распоряжаться принадлежащими им акциями в порядке, предусмотренном законодательством;
- передавать свои полномочия по участию в управлении деятельностью эмитента иным лицам путем выдачи доверенности либо заключения договора в порядке, установленном законодательными актами.

Решением общего собрания акционеров эмитента может быть предоставлено акционерам эмитента, владеющим простыми голосующими акциями, преимущественное право на приобретение дополнительно выпущенных эмитентом акций и утвержден порядок реализации такого права.

Акционеры эмитента имеют и другие права, предусмотренные законодательством и уставом эмитента.

7.2. Акционеры эмитента обязаны:
- не разглашать конфиденциальную информацию о деятельности эмитента, полученную в связи с участием в эмитенте;
- своевременно сообщать депозитарию, формирующему реестр владельцев ценных бумаг эмитента, обо всех изменениях данных о себе, включенных в реестр;
- выполнять иные обязанности, связанные с участием в эмитенте, предусмотренные законодательством.

Акционеры эмитента не отвечают по его обязательствам и несут риск убытков, связанных с деятельностью эмитента, в пределах стоимости принадлежащих им акций.

**8. Размер уставного фонда эмитента:**

Уставный фонд эмитента составляет 23 824 538 780 (Двадцать три миллиарда восемьсот двадцать четыре миллиона пятьсот тридцать восемь тысяч семьсот восемьдесят) белорусских рублей.

**9. Количество акций по категориям и типам привилегированных акций, номинальная стоимость акции:**

Акции простые (обыкновенные) – 127 310 (Сто двадцать семь тысяч триста десять) штук.
Акции привилегированные – 0 (Ноль) штук.
Номинальная стоимость акции – 187 138 (Сто восемьдесят семь тысяч сто тридцать восемь) белорусских рублей.

**10.** Временный государственный номер, присвоенный акциям, размещаемым путем проведения открытой продажи: 6-236-03-17096, дата его присвоения: 28 декабря 2012 г.

**11. Основные цели эмиссии и направления использования средств, полученных в результате проведения открытой продажи акций:**

Основные цели эмиссии: привлечение инвестиций для проведения модернизации и технического перевооружения производства эмитента с целью увеличения объемов реализации, расширения ассортимента выпускаемой продукции и освоения новых видов продукции, в том числе приобретение следующего оборудования:
- Листогибочный пресс (обеспечивает изготовление высококачественных деталей методом гибки, имеет ряд дополнительных операций, позволяющих расширить возможности станка);
- Горизонтально-расточной станок с ЧПУ (позволяет обрабатывать габаритные, тяжелые металлоконструкции, литые корпусные и объемные детали с высокой точностью, масса обрабатываемых деталей на поворотном столе до 30 т);
- Вертикально-фрезерный обрабатывающий центр с ЧПУ (обеспечивает выполнение сверлильных, фрезерных работ, расточку, сетку отверстий, фрезерование пазов с широким диапазоном перемещения);
- Горизонтально-фрезерный обрабатывающий центр с ЧПУ (выполняет операции: сверление, фрезерование, расточка, нарезание резьбы);
- Дробеметная установка проходного типа с рольгангом (обеспечивает очистку стальных компонентов, лист, профиль в горизонтальном положении);
- Универсальный токарно-винторезный станок (позволяет обрабатывать детали длиной до 8 м).

Основные направления использования средств, полученных в результате проведения открытой продажи акций:
Средства, полученные в результате проведения открытой продажи акций, будут использованы в соответствии с указанными основными целями эмиссии.
Временно свободные денежные средства эмитент вправе использовать на пополнение собственных оборотных средств.

**12. Планируемый объем эмиссии:** 21 479 886 778 (Двадцать один миллиард четыреста семьдесят девять миллионов восемьсот восемьдесят шесть тысяч семьсот семьдесят восемь) белорусских рублей.

**13. Количество, категории и типы привилегированных акций, размещаемых путем проведения открытой продажи акций:**

Простые (обыкновенные) акции – 114 781 (Сто четырнадцать тысяч семьсот восемьдесят одна) штука.
Привилегированные акции не выпускаются.

**14. Номинальная стоимость акции:**

Номинальная стоимость акции составляет 187 138 (Сто восемьдесят семь тысяч сто тридцать восемь) белорусских рублей.

**15. Место и время проведения открытой продажи акций:**

Открытая продажа акций осуществляется только через торговую систему Открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» (220013, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Сурганова, 48а, тел. +375 17 306 34 68) (далее – Биржа), ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь), в соответствии с законодательством Республики Беларусь и локальными нормативными правовыми актами Биржи.

**16. Период проведения открытой продажи акций (указывается дата начала и дата окончания либо порядок определения такой даты), а также период сбора эмитентом или по его поручению профучастником предложений (заявок) от лиц, намеревающихся приобрести дополнительно выпускаемые акции (указываются даты начала и окончания периода сбора предложений (заявок)):**

Дата начала продажи и заключения сделок на Бирже – 25 января 2013 г.
Дата окончания продажи и заключения сделок на Бирже – 23 февраля 2013 г.
Размещение акций эмитента путем их открытой продажи на Бирже осуществляется профессиональным участником рынка ценных бумаг Республики Беларусь – ОАО «БПС-Сбербанк», 220005, Республика Беларусь, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6 (Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам №02200/5200-1246-1086, выдано Министерством финансов Республики Беларусь, действительно по 30 января 2022 года) (далее – профучастник).
Период сбора эмитентом предложений (заявок) от лиц, намеревающихся приобрести дополнительно выпускаемые акции эмитента:
Дата начала периода сбора предложений (заявок) – 14 января 2013 г.
Дата окончания периода сбора предложений (заявок) – 21 января 2013 г.
Предложение (заявка) может быть подано нарочным, по почте или при помощи средств телекоммуникации (с представлением оригинала не позднее 3 (Трех) дней от даты подачи), и должно содержать:
- количество акций, предлагаемая цена одной акции, наименование, место нахождения, учетный номер плательщика юридического лица либо фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется), сведения о документе, удостоверяющем личность, место жительства (место пребывания) физического лица, представившего предложение (заявку);
- подпись заявителя, в том числе подпись руководителя юридического лица должна быть заверена оттиском его печати.

Если по итогам осуществления эмитентом сбора предложений (заявок) от лиц, намеревающихся приобрести дополнительно выпускаемые акции, общее количество акций, указанное в поступивших предложениях (заявках), превышает планируемый объем эмиссии, то предложения (заявки) удовлетворяются в порядке очередности их поступления. При этом превышение планируемого объема эмиссии акций не допускается.
Если по итогам осуществления эмитентом сбора предложений (заявок) от лиц, намеревающихся приобрести дополнительно выпускаемые акции, общее количество акций, указанное в поступивших предложениях (заявках), оказалось меньше планируемого объема эмиссии, то сначала удовлетворяются поданные предложения (заявки), оставшееся количество акций может быть реализовано в порядке очередности подачи заявок на биржевых торгах.
При проведении открытой продажи акций на Бирже отношения сторон оформляются в соответствии с требованиями, установленными Биржей по согласованию с Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь.
Договоры комиссии на покупку акций заключаются инвесторами с профессиональными участниками рынка ценных бумаг Республики Беларусь – членами Секции фондового рынка Биржи.
Список членов Секции фондового рынка размещен на сайте Биржи по адресу: http://www.bcse.by/bcse-stock-market/participants/stockMembers.aspx.
В двухмесячный срок с даты окончания проведения открытой продажи акций общим собранием акционеров должны быть утверждены ее результаты.

**17. Дополнительные условия размещения акций эмитента:**

Размещение акций осуществляется резидентам и нерезидентам Республики Беларусь (физическим и юридическим лицам).
Оплата акций осуществляется в долларах США по цене за одну акцию не ниже ее номинальной стоимости в эквиваленте по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату совершения сделки.
Количество акций в лоте – 1 штука.

**18. Сведения о месте, времени и способе ознакомления с проспектом эмиссии акций:**

С проспектом эмиссии акций можно ознакомиться по адресу: Республика Беларусь, Минский район, п. Гатово, ОАО «Черметремонт», приемная Генерального директора эмитента, или по телефону + 375 17 503-42-27, ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 17.00.

**19. Информация о профессиональном участнике рынка ценных бумаг, услуги которого использовались при организации выпуска акций:**

Наименование: ОАО «БПС-Сбербанк».
Место нахождения: Республика Беларусь, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6.
Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам №02200/5200-1246-1086, выдано Министерством финансов Республики Беларусь, действительно по 30 января 2022 года.

*Генеральный директор
ОАО «Черметремонт»* *В.Г. Шабанов*

*Главный бухгалтер
ОАО «Черметремонт»* *С.В. Русецкая*

■ Пальчыкі абліжаш!

# НАКРЫВАЕМ СТОЛ РАЗАМ

## з гераінямі «Сустрэч без абцасаў»

**НАПЯРЭДАДНІ Новага года «Звязда» папрасіла беларускіх жанчын-кіраўнікоў расказаць, якія стравы будуць у іх на святочным стале. А раптам хто-небудзь з чытачоў натхніцца і возьме які-небудзь рэцэпт (а чаму б і не ўсе?) сабе на ўзбраенне?**
**Традыцыі традыцыямі. І ад іх нашы дзелавыя жанчыны не адмаўляюцца. Усе, як адна, будуць гатаваць «Аліўе», «Мімозу», селядзец пад шубай і халадзец... Разам з тым, прызналіся, што плануюць здзівіць сваіх хатніх і нечым экзатычным... Тым больш, і «гаспадыні года» экзотыка і творчы падыход будзе даспадобы. Змяя — не толькі мудрая і рацыянальная, але і вытанчаная жывёла, любіць раскошныя стравы і ўсялякія далікатэсы.**

### КАЧКА Ў ЯБЛЫКАХ З ЧАРНАСЛІВАМ ад дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства «Світанак» Іны МАЛІНОЎСКАЙ



Новы год у Іны Віктараўны (пасля прафесійнага Дня лёгкай прамысловасці) — самае любімае свята. Таму і падрыхтоўка да яго адпаведная. Па традыцыі, разам з мужам загадзя замаўляюць **свежую качку.** Забіраюць яе 31 снежня і фаршыруюць за некалькі гадзін да бою курантаў.

— Ніякіх асаблівых сакрэтаў няма: галоўнае прымацца за справу ў добрым настроі і не баяцца фантазіраваць, — прызнаю ўсміхаецца Іна Маліноўская. — Пачынаю з таго, што акуратна выдаляю рукамі астаткі пёраў, усе вантробы і лішкі ўнутранага тлушчу. Ачышчаную птушку дасканала мыю і даю ёй высахнуць. Затым у невялікім кубачку змешваю **1 ст. л. розных спецый** (базілік, чабор, салодкую папрыку, куркуму і г.д.) з **1 ч. л. дробнай солі**. Хоць лепшая прыправа да ежы, як я часта жартую — гэта голад *(смяецца)*. Атрыманай сумессю націраю качку знутры і звонку. Гатую яе не першы год, таму, каб здзівіць сваіх блізкіх, штораз творча падыходжу да гэтай справы, эксперыментую з начынкай. Начыняю яе праз адтуліну ў жываце **курагой, чарнаслівам (без костачкі), апельсінамі, арэхамі,** пасля чаго зашываю ніткай. Сухафрукты папярэдне заліваю кіпенем хвілін на 30. Можна **рысу** туды яшчэ дадаць, каб крыху звязаць тлушч, які вылцякае пры запяканні. На дно глыбокай гусятніцы наразаю невялікімі кавалачкамі **2 яблыкі без лупіны** (яблыкі трэба крыху пасаліць). Затым кладу на яблычны «дыванок» качку, абмазаную алеем, і стаўлю «шэдэўр» у разагрэтую да 200 градусаў духоўку. За час гатавання — 2,5-3 гадзіны — пераварочваю качку 1-2 разы, каб яна раўнамерна падрумянілася. Гатовую птушку выкладваю на святочную вялікую талерку, упрыгожваю **долькамі апельсіна, яблыка, арэхамі.** Абавязкова ў асобным посудзе падаю соус з яблыкаў, у якім качка гатавалася. За навагоднім сталом, як правіла, збіраемся ўсёй сям'ёй у нас дома. Праз 15 хвілін, я не перабольшваю, ад «залацістай прыгажуні» застаецца толькі шкілет. А гэта для любой гаспадыні лепш за самую красамоўную пахвалу.

❐ ❐ ❐

### КУРЫЦА З АНАНАСАМ ад першай жанчыны віцэ-мэра ў гісторыі Мінска Жанны БІРЫЧ

Істотную ўвагу сервіроўцы святочнага стала надае і Жанна Эдуардаўна.

— На Новы год да мяне звычайна прыязджае маці, якая з дзяцінства прывіла мне любоў да прыгажосці. Святочны абрус, прыгожы посуд і свечкі, як шампанскае і мандарыны, — неад'емныя элементы майго навагодняга стала. Як на Новы год, так і на Каляды гатую шмат страў. Абавязкова стараюся пабалаваць сябе і сваіх блізкіх нейкімі далікатэсамі.

Але і без традыцыйных простых салатаў, такіх, як Аліўе» і селядзец пад «шубай», ні адзін Новы год Жанны Бірыч не абыходзіцца.

«Я не магу гэтыя салаты не рабіць, бо адну з іх вельмі любіць мая дачка, другую — маці. Што датычыцца мяса, то звычайна аддаю перавагу бужаніне. Але год Змяі, чула, трэба сустракаць з курыным мясам. Таму, я ўжо вырашыла, буду гатаваць курыцу з ананасам. Гэта страва кітайскай кухні. Я вельмі люблю кітайскую кухню. Курыца атрымліваецца вельмі смачная і святочная. І яе гатаванне не забірае шмат часу. Гэта для мяне важна ў сувязі з маёй пастаяннай занятасцю. Пакуль варыцца курыца, гатую марынад: **1 ст. л. дробна нарэзанай зялёнай пятрушкі змешваю з 2 ч. л. крухмалу, 2 ст. л. алею,** дадаю **соль і перац на смак. 500 г адваранага курынага мяса** наразаю тонкімі палоскамі і змяшчаю ў прыгатаваны марынад. Хвілін праз 15 абсмажваю яго ў алеі. Затым бяру **200 г спаржавай фасолі і палову ананаса, нарэзанага лустачкамі,** і тушу на слабым агні пад накрыўкай. Змешваю **1 ст. л. лыжку крухмалу, 3 ст. л. алею, сок ананаса, парашок імбіру на кончыку нажа** і ўліваю ў кіпячы курыны булён (2/3 шклянкі). Праз колькі секунд дадаю **1 шклянку белага дэсертнага віна,** паліваю мяса соусам, які атрымаўся, і падаю яго на стол з гарнірам са спаржы і ананаса. Курыца атрымліваецца — пальчыкі абліжаш. Я не сумняваюся, што гаспадыня, якая хоць адзін раз скарыстаецца гэтым рэцэптам, абавязкова занатуе яго ва ўласны кулінарны сшытак, як гэта зрабілі калісьці і я, і мая дачка.



❐ ❐ ❐

### «ДЗІКАЯ» ЭКЗОТЫКА ад дырэктара Беларускага дзіцячага хоспіса Ганны ГАРЧАКОВАЙ



Ганна Георгіеўна прызналася, што вельмі традыцыйная ў плане асноўных страў. На Новы год заўсёды гатуе птушку: качку, гусака альбо курыцу. А вось з салатамі эксперыментуе.

— Кожны раз напярэдадні свят я кажу сама сабе, што нічога не буду гатаваць. Усё будзе проста і прымітыўна. Прыгатую трошкі, чыста сімвалічна, не як раней, ламанкамі *(смяецца)*, салату з гарошкам — і ўсё. Я не люблю «Аліўе». Але гэта любімая салата маёй дачкі. І штораз перад самым Новым годам на мяне находзіць натхненне. І мой навагодні стол ломіцца ад розных салатаў. Я іх вельмі люблю. Менш за пяць на Новы год ніколі не бывае».

Пасля гэтых слоў Ганна Гарчакова пачала дзяліцца са мной рэцэптамі сваіх любімых салатаў. Вось толькі дзве з іх, якія я вырашыла выпрабаваць абавязкова.

### САЛАТА «ЛЮБІМАЯ»

«Доўгай тонкай саломкай надзіраю на тарцы **сырую моркву і буракі.** Такой жа тоненькай саломкай наразаю **смажаное мяса і смажаную** (гэта істотная асаблівасць гэтай салаты!) **бульбу**. Усё гэта змешваю і дадаю **марынаваныя грыбы.** Як правіла, апенькі, але можна і іншыя — галоўнае, каб яны былі востранькія. Па рэцэпце трэба запраўляць маянэзам, але паколькі я не вельмі люблю **маянэз**, то запраўляю сумессю маянэзу са смятанай. Гэтая салата, несумненна, спадабаецца вам і вашым дарагім гасцям».

### САЛАТА «ДЗІКАЯ ЭКЗОТЫКА»

«Гэтая незвычайная французская салата на аматара. Гатуецца яна таксама вельмі проста. **10 буйных сырых шампіньёнаў** мыю і наразаю плоскімі кавалачкамі. Асобна раблю соус: дробна рэжу **2 сярэднія пучкі кінзы** (недзе 50 г), дадаю **1 няпоўную ст. л. добрай таматнай пасты ці кетчупу** (што хто любіць), **2-3 сярэднія зубчыкі часнаку, 1 ч. л. з горкай куркумы** (самае важнае!), **крыху аліўкавага алею і вінаграднага воцату, соль на смак.** Усё перамешваю і заліваю духмяным соусам шампіньёны. Пакідаю хвілін на 15, каб грыбы прамарынаваліся. Перад падачай на стол пасыпаю **дробна нарэзанай рэпчатай цыбуляй,** упрыгожваю **зелянінай.** Гэтая салата не толькі смачна пахне, але і ліквідуе калорыі *(усміхаецца)*».

❐ ❐ ❐

***На развітанне мае гераіні папрасілі павіншаваць чытачоў «Звязды» з надыходзячымі святамі. Усе як адна пажадалі ў новым годзе здароўя! А таксама лёгкасці і настрою! «Старайцеся бачыць у жыцці пазітыў, а не негатыў, — сказала Ганна Гарчакова. — І самае галоўнае: жадаю, каб вы ніколі не былі адзінокімі! Каб заўсёды, і ў радасці, і ў горы, нехта быў побач. Беражыце сябе і сваіх блізкіх!»***

***Застаецца дадаць: давайце ў 2013-м, які абвешчаны Годам беражлівасці, не будзем эканоміць на добрых справах і добрых словах. І няхай першым такім словам стане шматразовае «дзякуй» кожнай гаспадыні за навагодні стол, накрыты з душой для сваёй сям'і.***

Надзея ДРЫЛА.
**Фота Надзеі БУЖАН.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



# ...А ЗА АКНОМ ТО СНЕГ, ТО ДОЖДЖ

## Тэмпературныя рэкорды беларускай зімы

**ПАВОДЛЕ падлікаў айчынных кліматолагаў, самым халодным месяцам года ў Беларусі з'яўляецца студзень. Яго сярэднямесячная тэмпература звычайна складае ад мінус 4,5 градуса на паўднёвым захадзе да мінус 8 градусаў на паўночным усходзе краіны.**

Як паведаміла рэдакцыі **спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА,** за апошнія 150 гадоў самым халодным быў першы месяц 1987 года, калі сярэднямесячная тэмпература студзеня трымалася ажно на 9—10 градусаў ніжэй за кліматычную норму. Даволі халадна было ў студзені ў 1950, 1963, 1969, 1972, а таксама ў 1995 і 2010 гадах. Тады сярэднямесячная тэмпература была на 5—8 градусаў ніжэй за норму. Анамальна цёплы студзень назіраўся ў 1952, 1975, 1983, 1989, 1990, 1994, 1998, а потым і ў 2005 і 2007 гадах, калі сярэднямесячная тэмпература была ўжо на 5—9 градусаў вышэй за норму. У гэтыя гады ў студзені назіралася сур'ёзная адліга.

А вось анамальна моцныя маразы **ў навагоднюю ноч** былі зафіксаваны на поўначы Беларусі — на метэастанцыі «Езярышча» Глыбоцкага раёна **ў 1978 годзе — мінус 38,6 градуса.** Самае цёплае навагоднее свята прыпадае на 1 студзеня 2007 года, калі ў Ваўкавыску было плюс 7,1 градуса.

У Мінску прыкладна раз у 5 гадоў сярэднясутачная тэмпература 1 студзеня бывае вышэй за 0 градусаў. Недзе адначы за 20 гадоў тэмпература паветра ў такую святочную ноч дасягае мінус 20 градусаў. Вельмі холадна ўначы на 1 студзеня было ў 1941 годзе — мінус 30 градусаў. Максімальна цёплым лічыцца першы дзень 1984 года, калі ў сталіцы Беларусі было ажно плюс 6 градусаў.

На першы месяц года прыпадае і абсалютны рэкорд мінімальных тэмператур у Беларусі. **У студзені 1940 года** на метэастанцыі ў раёне г.Талачын **было зафіксавана мінус 42,2 градуса.** Абсалютны максімум тэмпературы студзеня склаў ажно плюс 11,9 градуса (1993 год, метэастанцыя «Высокае», што на поўначы пад Брэстам).

**На жаль, надвор'е ў апошнія дні гэтага года будзе няўстойлівым, паведамляе Вольга Фядотава.**

Калі 29 і 30 снежня ўначы нас падмарозіць (бо чакаецца мінус 2—8, а пры праясненнях — і да мінус 9—12 градусаў), то ў апошні дзень года зіма «падкіне» сюрпрыз.

У гэты дзень атлантычны цыклон накіруе ў глыб кантынента больш вільготнае і цёплае паветра з боку Заходняй Еўропы. Таму 31 снежня сіноптыкі прагназуюць на поўначы і ў цэнтральных раёнах Беларусі снег і мокры снег. Месцамі туман і слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы на 31 снежня 0—7 марозу, а ўдзень ужо ад мінус 3 да плюс 3 градусаў. Першага студзеня чакаецца мокры снег і дождж пераважна на поўначы Беларусі. Месцамі туман, на дарогах слізка.

Тэмпература паветра ў навагоднюю ноч будзе ад мінус 5 градусаў па ўсходзе да 2 цяпла на захадзе краіны. Удзень у аўторак чакаецца ад мінус 2 да плюс 2 градусаў. У сталіцы ўначы на 1 студзеня будзе 0 — мінус 2 градусы, а ўдзень ужо 0 — плюс 2. На працягу сутак магчымы невялікі мокры снег і нават дождж.

Паводле папярэдніх прагнозаў, захаваецца няўстойлівае надвор'е і 2 студзеня. Уначы на сераду крыху падмарозіць да 0 — мінус 7 градусаў, аднак удзень чакаецца зноў ад мінус 3 да плюс 2 градусаў. На паўночным захадзе кароткачасовыя ападкі — мокры снег і дождж. Вось такое наша «вільготнае» свята...

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЯК ПЕРАЖЫЦЬ СВЯТА

## І НЕ ПАДАРВАЦЬ ЗДАРОЎЕ...

**Начальнік аддзела харчавання Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні, доктар медыцынскіх навук Элеанора КАПІТОНАВА:**



— Перабор з ежай часцей за ўсё бывае менавіта на Новы год. Як жа прыгатаваць святочны стол, каб і Змяі дагадзіць, і здароўе не сапсаваць? Па-першае, не трэба цэлы дзень галадаць, чакаючы бяседы. Пажадана 31 снежня харчавацца ў звычайным рэжыме і сесці за навагодні стол не галодным. Лепей не гатаваць разнастайныя складаныя салаты з неверагоднымі соусамі, а зрабіць некалькі прыгожых вялікіх страў з натуральнымі прадуктамі: «мясную талерку» лепш за ўсё зрабіць сваімі рукамі. Адварыць або запячы розныя віды мяса (ялавічыну, свініну, курыцу або індычыну, язык) з прыправамі ды карэннем, астудзіць і прыгожа нарэзаць. «Рыбную талерку» прыгатуйце з розных відаў рыбы і морапрадуктаў, можна выкарыстоўваць і натуральныя рыбныя кансервы. Галоўнае — упрыгожыць такую талерку з выдумкай.

Упрыгажэннем стала стануць рознакаляровыя «гароднінная» і «садавінная» талеркі. А для пачатку застолля можна выкарыстаць парцыённую заліўную рыбу, птушку або мяса. У якасці асноўнай стравы няхай будзе адна мясная або рыбная страва. Лепей калі гэта будуць запечаныя ці прыгатаваныя на грылі стравы з гароднінай і свежым зяленівам. Як ніколі падыдзе трус — і смачна, і калорый няшмат, і Змяі спадабаецца. Ну а для дэсерту не пашкадуйце разнастайнасці садавіны, злучанай з жэле, арэхамі, нізкакаларыйным ёгуртам, тварожнай пастай або ягадным соусам.

**Загадчык наркалагічнага рэабілітацыйнага аддзялення РНПЦ псіхічнага здароўя Уладзімір ІВАНОЎ:**



— Каб не сапсаваць сабе дзень пасля свята, трэба загадзя спланаваць, колькі алкаголю вы вып'еце. Звычайна лёгкі, эйфарычны стан чалавек адчувае пасля першай чаркі ці келіха. Потым гэты стан знікае, і надыходзіць звычайнае ап'яненне, звужэнне межаў свядомасці. Таму трымайцеся нейкага плану ў выпіўцы.

Не варта садзіцца за стол на галодны страўнік. У чаканні свята перакусіце прадуктамі, багатымі на пратэін (малако, сыр). Усмоктванне алкаголю запавольваюць бульба, мяса, салёныя арэшкі, кукуруза...

Калі вы прачнуліся ў нармальным стане, а свята працягваецца, дачакайцеся абеду. Даказана, што алкаголь лягчэй перапрацоўваецца і выклікае менш наступстваў у другой палове дня. Калі напярэдадні вы перабралі, то на наступны дзень ужываць алкаголь не варта наогул. Каб палепшыць самаадчуванне, традыцыйна прымяняюць расол, салёную капусту і агуркі. У здаровага чалавека пахмелле праходзіць за некалькі гадзін. Калі дрэнны стан захоўваецца — гэта прыкмета алкагольнай залежнасці або наяўнасці іншага захворвання — напрыклад, панкрэатыту ці гіпертаніі.

Сусветная арганізацыя аховы здароўя вызначыла, што для дарослага мужчыны бяспечнай лічыцца доза 100 мл гарэлкі за суткі, для жанчыны — 70 мл. Калі гаварыць пра піва, то не больш за паўлітра светлага 4-5-працэнтнага піва за дзень. Аднак гэта ўсяго толькі статыстычныя звесткі, якія не трэба ўспрымаць літаральна і прымаць «бяспечныя» дозы штодня. Будзьце адказнымі ў гэтым пытанні!



**Загадчыца псіхалагічнай лабараторыі Мінскага гарадскога псіханеўралагічнага дыспансера Таццяна УШАКЕВІЧ:**



— Провады старога і сустрэча новага года для многіх з нас — нейкая мяжа, калі тое, што нам перашкаджала, сыходзіць у нябыт, і так хочацца верыць, што ўсё будзе лепей. Самая важная з прыкмет, у якія мы верым — як Новы год сустрэнеш, так яго і правядзеш.

Святкаванне Новага года — стымул для змены звыклага ходу жыцця. Але галоўнае — наш настрой у гэту ноч. Не настойвайце на абавязковым вытрымліванні нейкіх прыкмет і традыцый. Шчасце залежыць не ад гэтага. Адпачываць, святкаваць трэба толькі для сябе. Калі вы пасварыліся з любімым чалавекам, зрабіце яму крок насустрач яшчэ да Новага года. А можа быць, вы ацэніце сітуацыю, і вырашыце, што навагодняя ноч і наступны год будуць не такімі ўжо дрэннымі без гэтага чалавека? Калі вашы ўжо не такія малыя дзеці бунтуюць і не хочуць святкаваць Новы год за сямейным сталом — адпусціце іх, але паклапаціцеся пра іх бяспеку. Самі ж прыгадайце ў навагоднюю ноч, што вы не толькі бацькі, але пара закаханых.

**Як сустрэць Новы год аднаму?**

Лічыцца, што каля 2 працэнтаў насельніцтва краіны адзначае гэтае свята ў адзіноце. Аднак адзінота — стан душы, а не адсутнасць акружэння. Прысвяціце навагоднюю ноч сабе. Парадуйце сябе падарункамі — купіце тое, аб чым даўно марылі. Накрыйце стол, перагледзьце любімыя фільмы. І... загадайце жаданне, калі гадзіннік праб'е поўнач! Можна крыху пакуціць у рэстаране ці клубе. Або схадзіць на гарадскую ёлку. Урэшце, пазваніце таму, з кім даўно не было часу паразмаўляць. Ваш святочны настрой — у вашых руках!

**Як сустрэць Новы год з дзецьмі?**

Выдатная традыцыя — прыцягнуць да ўпрыгожвання ёлкі дзяцей. Няхай яны вешаюць на яе не толькі цацкі, але і мандарыны, пячэнне, цукеркі, можна нават загарнуць іх у бліскучую паперу. Зрабіце з дзецьмі цацкі сваімі рукамі (наматайце ніткі на абмазаны клеем паветраны шарык). Гэтая чароўная навагодняя майстэрня ўжо стане святам. Можна пазваць паболей дзяцей і арганізаваць маскарад.

Калі навагодняя ноч пройдзе не так, як вам хацелася б, сустрэньце яго яшчэ раз — у Стары Новы год!

**Урач-эпідэміёлаг аддзела прафілактыкі ВІЧ/СНІДу Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Уладзімір ЗЯЛЮТКІН:**



— Як ні круці, а навагоднія святы для ўсіх дарослых людзей суправаджаюцца спіртнымі напоямі. Ну не ўмеем мы атрымліваць асалоду ад свята на цвярозую галаву! Не весела нам. А дзе ёсць спіртное, там заўсёды будуць «подзвігі» і смелыя рашэнні. Аднак сэкс на п'яную галаву не прынясе станоўчых эмоцый і пажаданай разрадкі. Дый праблем дадасць часам...



Цана навагодняй ночы, якая завершылася сэксам з малазнаёмым партнёрам, можа аказацца надта высокай. Усё ж такі Новы год мы святкуем не раз у жыцці, а вось здароўе ў кожнага адно. Даследаванні паказваюць, што пад уздзеяннем алкаголю людзі часцей займаюцца сэксам без прэзерватыва, а больш за палову дзяўчат і хлопцаў іх не носяць з сабой.

Пры палавым неабароненым кантакце передаецца звыш 30 узбуджальнікаў інфекцыйных захворванняў. Яны ніколі не праходзяць самі па сабе, без лячэння. А для такіх інфекцый, як хламідыёз, мікаплазмоз, урэаплазмоз часам характэрная адсутнасць сімптомаў. У Беларусі адзначаецца ўстойлівае зніжэнне або стабілізацыя захваральнасці на большасць інфекцый, што перадаюцца палавым шляхам (ІППШ), аднак яе паказчыкі застаюцца значна больш высокімі, чым у краінах Заходняй і Цэнтральнай Еўропы. Штогод у ВІЧ-інфіцыраваных, якія стаяць на ўліку, рэгіструюцца яшчэ выпадкі ІППШ з-за неабароненых палавых кантактаў.

Дарэчы, са 100 новых выпадкаў ВІЧ толькі два прыпадае на моладзь ва ўзросце да 19 гадоў, 30 выпадкаў — на 20-29 гадоў. На жаль, значная колькасць людзей пасля 30-ці чамусьці маюць устойлівы стэрэатып, што заразіцца ВІЧ рызыкуе ў асноўным вузкая катэгорыя асоб, якія займаюцца «камерцыйным сэксам», маюць вялікую колькасць палавых партнёраў, ужываюць ін'екцыйныя наркотыкі. Аднак сёння рызыкуе кожны, хто мае ў сваім жыцці вопыт неабароненых сэксуальных кантактаў з непастаянным партнёрам.

Атрымлівайце асалоду ад свята, але не забывайце пра неабходнасць засцярогі. Каб кантраляваць сябе і не даць сітуацыі выйсці з-пад кантролю, дабірайцеся дадому разам з сябрамі, калі былі ў кампаніі. І абавязкова насіце з сабой прэзерватыў, які дае максімальную абарону.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

---

**Юлія Аляксандрава, вядучая праграмы «Навіны рэгіёна» Агенцтва тэлевізійных навін Белтэлерадыёкампаніі:**



**—У адыходзячым годзе, па-першае, папоўнілася мая «цукровая кампанія» — так я ласкава называю сваіх любімых пляменнікаў. Гэтым летам у брата нарадзілася прыгажуня-дачушка Міланачка, я стала цёткай другі раз. Па-другое, сюрпрызамі парадавала прафесія. Пасля трох гадоў рэпарцёрскай працы мне прапанавалі перасесці ў крэсла вядучай выпуску навін. Зараз у мяне па 12 прамых эфіраў на тыдзень, кожны з якіх для мяне — як палёт у космас. Таксама сёлета ўбачыў свет мой аўтарскі фільм для праекта «Журналісцкае расследаванне» пра іншаземцаў у Беларусі. З культурных падзей хочацца адзначыць тэатральны фестываль «ТэАрт», падчас якога ўдалося паглядзець скандальную пастаноўку Рамэа Кастэлучы. Безумоўна, не магу не ўспомніць баль у Нясвіжскім замку. Нават тое, што трапіла туды па працы, не перашкодзіла адчуць атмасферу XVII стагоддзя і паразмаўляць з гасцямі. Ад новага года чакаю невычэрпнага натхнення і новых ідэй для праектаў. Дарэчы, самую «свежую» задуму гледачы ўбачаць ужо ў студзені. Мы вырашылі зрабіць больш разнастайным адпачынак жыхароў Мінска і Мінскай вобласці па нядзелях. Запускаем выніковы выпуск «Навін рэгіёну», дзе з'явяцца новыя рубрыкі, актуальныя інтэрв'ю. Так што — да сустрэчы ў эфіры!**

■ Перамога волі

# АД АЗАРАНКІ ДА ШАЎЦОВА

**«Звязда» падводзіць спартыўныя вынікі 2012 года і сярод разнастайных падзей вылучае тыя, якія дакладна можна ўносіць у гісторыю айчыннага спорту**

**Вось і ўсё. Засталося пацярпець яшчэ трохі, і на навагодніх сталах з'явяцца салатніцы з аліўе, каўбаскі, бакалы з бурлівым залатым шампанскім, а пад пахкімі ялінкамі — таямнічыя падарункі. Людзі ўжо даўно звыкліся ўспрымаць 31 снежня святочна, аднаўляючы ў думках самае прыемнае, што здарылася з імі, сваякамі, сябрамі за апошнія 364 дні. У айчынным спорце таксама хапала не толькі таго, ад чаго можна было за галаву хапацца (фіяска беларусаў на Алімпіядзе ўсе яшчэ памятаюць добра), але і таго, што прыносіла радасць ад шчаслівых вікторый.**


Фота БЕЛТА.

Сяргей Мартынаў: «Ёсць золата!»

Між іншым, ёсць у нас свая Вікторыя, імя якой цалкам адпавядае мужнаму характару гэтай працавітай дзяўчыны. Беларуская тэнісістка **Вікторыя Азаранка** не толькі ў міксе з Максімам Мірным перамагла на Алімпіядзе ў Лондане, а яшчэ і скончыла гэты сезон на першым месцы рэйтынгу WTA. Вынік для нашага тэніса, безумоўна, фантастычны. Беларускія тэнісісткі яшчэ ніколі не ўздымаліся так высока. Адметна, што наша тэнісная прыма мае добрыя магчымасці пацвердзіць свой сёлетні поспех. Вікторыі яшчэ 24 гады, а значыць, усё ў яе кар'еры яшчэ наперадзе.

Фантастычным год Дракона стаў і для нашага мужнага стралка **Сяргея Мартынава**. Да свайго алімпійскага «золата» ён ішоў доўга: толькі на 6-х сваіх Гульнях ён атрымаў доўгачаканы медаль. Нібы Фартуна сапраўды выпрабоўвала спартсмена на трываласць: «Ці не збочыць ён з абранай сцяжыны?». І не, не збочыў! Двойчы быў трэцім на Алімпіядзе і не здаваўся, не сыходзіў. І вось сёлета здолеў усё ж такі ўзняцца на вышэйшую прыступку ў спаборніцтвах у стральбе з дробнакалібернай вінтоўкі з 50 метраў (лежачы). Што казаць, сапраўдная перамога волі, якой так часам не хапае нам не толькі ў спорце, але і непасрэдна ў сваёй працы.

Здавалася, яшчэ нядаўна заўзятары сустракалі ў аэрапорце жаночую зборную Беларусі па біятлоне, але з таго часу ўжо прайшло больш за 8 месяцаў. Толькі галоўнае, што не знікла, — майстэрства нашых зімніх стралкоў. Найперш гэта тычыцца **Дар'і Домрачавай**, уладальніцы двух малых крыштальных глобусаў Кубка свету 2011/12. Будзем верыць, што і новы сезон стане для яе паспяховым. А пакуль усіх парадавала яшчэ адна айчынная біятланістка. На этапе Кубка свету ў славенскай Паклюцы **Надзея Скардзіна** ўпершыню трапіла на п'едэстал, заваявала бронзавую ўзнагароду ў спрынце. Віншуем!

Ураджайным на медалі гэты год быў і для нашай плыўчыхі **Аляксандры Герасіменя**. На жаль, Саша так і засталася без алімпійскага «золата», аднак два сярэбраныя медалі ў Лондане — поспех, якім таксама ганарыцца трэба.

Нельга не ўзгадаць і самае буйное дасягненне нашых гульнявікоў — выхад **зборнай Беларусі па гандболе** на чэмпіянат свету, які прыме Іспанія. Падобнага балельшчыкі чакалі доўгіх 17 гадоў і дачакаліся! Гэта менавіта той выпадак, дзе выдатна праявіўся трэнерскі геній **Юрыя Шаўцова** і лідарскія якасці **Сяргея Рутэнкі**. У стадыі плэй-оф нашы хлопцы змагаліся з вопытнымі славакамі. Перамаглі ў гасцях у два мячы, але дома саступілі ў адзін кідок.

Тым не менш, выніковая перамога была нашай. «Мінск-Арэна» літаральна патанала ў авацыях. Каманда іх сапраўды заслужыла. Шчаслівыя, удзячныя балельшчыкі нават убачылі ў камандзе Юрыя Анатольевіча славуты мінскі СКА Спартака Міранові ча, за які калісьці так выдатна гуляў сам глаўкам цяперашняй зборнай. Адказны старт зборнай ужо не за гарамі. 12 студзеня беларусы правядуць у Сарагосе свой першы матч. Наш першы сапернік — зборная Польшчы.

Упэўнены, ёсць тыя, у каго перамогі **БАТЭ** ў футбольным першынстве Беларусі выклікаюць пазяханне. Маўляў, няма інтрыгі ў нашым чэмпіянаце, няма чаго глядзець. Каманда Віктара Ганчарэнкі ў дзявяты раз заваявала залатыя ўзнагароды чэмпіянату краіны. І гэта ў той год, калі здавалася, што вось-вось і «Гомель», «Шахцёр» паспрачаюцца за чэмпіёнства. Аднак БАТЭ зрабіў у нашым чэмпіянаце ўсё па фэн-шуй — як мае быць. Паглядзім, як будзе ў наступным сезоне. Дарэчы, барысаўчане, якія ў чарговы раз падарылі нам цудоўную футбольную восень (перамогі над клубамі «Баварыя» і «Ліль», спадзяюся, яшчэ памятаюць), паволна перакінулі масток у футбольную зіму. Так-так, менавіта ў лютым, у розыгрышы Лігі Еўропы БАТЭ сустрэнецца з набітым «зоркамі», як слоік агуркамі, турэцкім «Фенербахчэ». Туркі ўжо загадзя сябе абвясцілі фаварытамі. Але не богі гаршкі абпальваюць. Мяч круглы, а поле роўнае. Усё вызначыць сама гульня, а не пустыя размовы. Здаецца, падарунак ад святога Мікалая ў выглядзе перамогі над стамбульцамі быў бы да месца.

**Тарас ШЧЫРЫ**


Фота Тараса ШЧЫРАГА.

Бравыя хлопцы Юрыя Шаўцова.

■ Калі душы нечага хочацца...

# А ІДЗІЦЕ ВЫ Ў ЛАЗНЮ!

***Куфлі з півам, чатыры мужчыны ў прасцінах, 31 снежня і фраза «Давай узважымся на брудэршафт». Узгадваеце сцэну? Наўрад ці вы не пазналі неад'емны атрыбут Новага года — камедыю Эльдара Разанава «Іронія лёсу, альбо З лёгкай парай!». Амаль 40 гадоў таму святкаванне героямі Новага года ў лазні неўпрыкмет перарасло ў сапраўдны экстрым. Калі вы будзеце шукаць экстрым, сустракаючы 2013 год, праблем не павінна ўзнікнуць першапачаткова. Дастаткова скласці ў інтэрнэце правільны запыт — і незвычайны Новы год у вас «у кішэні» (калі, вядома, можна лічыць экстрымам эратычны балет і шоу факіра). А можна пайсці шляхам герояў камедыі і 31 снежня паклікаць сяброў... у лазню.***



***За 40 гадоў не толькі горад Ленінград паспеў стаць Санкт-Пецярбургам, але і грамадскія лазні некалькі змянілі сваё аблічча і ўнутранае начынне. А таму паслядоўнікі герояў Мягкова і кампаніі могуць сутыкнуцца з некаторымі нечаканасцямі. Карэспандэнт «Звязды» ўзяў на сябе ролю «выратавальніка» вясёлага Новага года і звязаўся з загадчыкам лазнева-аздараўленчага комплексу «Малінаўка» Мікалаем ЖАЛАБКОВІЧАМ, каб параўнаць лазні 1970-х з сучаснымі.***

Героі камедыі прыйшлі ў лазню ў апошні дзень снежня. Ці не застануцца тыя, каму карціць трапіць у лазню 31-га, у адзіноце перад зачыненымі дзвярыма? Спадар Жалабковіч супакойвае і абяцае, што не застануцца. Лазня ў Малінаўцы будзе працаваць да 22 гадзін нават ў апошні дзень снежня. Відавочна, што апошняя пара з яе выйдзе ўжо толькі пад бой курантаў.

Вопратцы герояў кінафільма пазайздросцілі б і багі Алімпу — лазні 1970-х, як вынікае з фільма, шчодра забяспечвалі наведвальнікаў белымі прасцінамі. У гэтым плане нічога не змянілася — апрануцца ў стылі навагодняга Зеўса ці Артэміды вы зможаце, ахвяраваўшы сімвалічныя 4 500 рублёў. Фінансавай раскошай у параўнанні з прасцінамі выглядае венік, які каштуе 18 240 рублёў. Героі фільма знайшлі выйсце і наведалі лазню са сваімі. Вы можаце смела ісці іх шляхам, асабліва калі побач з домам у вас расце бярэзнік. Вяжыце летам венікі, а потым бярыце іх з сабой. Мікалай Жалабковіч абяцае, што іх на ўваходзе не адбяруць.

Свае прыгоды нашы героі пачыналі са сціплых куфляў з півам. У азначанай лазні ёсць свой бар, дзе наведвальнікі могуць пакаштаваць гэты пенны напой. Галоўнае — не перабраць з аб'ёмам, бо ёсць рызыка так і не трапіць у парылку. Таксама не атрымаецца і працягнуць вечарыну больш моцнымі напоямі, як гэта зрабіла чацвёрка ў фільме Разанава. З гарэлкай у лазні «размова кароткая». Так што калі на ваша пытанне: «Куды вы мяне несяце?» вы пачуеце адказ: «Насустрач тваймy шчасцю!», то наўрад ці суразмоўцамі будуць вашы сябры. Хутчэй за ўсё, гэта будуць ахоўнікі лазні.

Тое ж самае датычыцца і цыгарэт. У «Іроніі лёсу...» героі без аніякіх праблем бавілі час з цыгарэтай непасрэдна ў будынку. Калі ў вас ёсць такая звычка — прыйдзецца выходзіць на вуліцу. Тут жа прадастаўляецца і бясплатная магчымасць акунуцца з галавой у снег. Паверце, гэта не нашкодзіць вашаму здароўю, у адрозненне ад нікаціну. Таму зрабіце выбар на карысць снегу.

Апошні атрыбут Новага года «па-разанаўску» — вагі. Калі вы прайшлі вышэйапісаныя выпрабаванні півам і цыгарэтамі — час узважыцца «на брудэршафт». Усё неабходнае (менавіта вагі) вы знойдзеце ў лазні. Сачыце за тым, каб маса выпітага піва не была большай за страчаную вамі масу ў парыльцы, і памятайце, што комплекс аздараўленчы, а не забаўляльны, а інакш ёсць рызыка прачнуцца ў выцвярэзніку. Ці, напрыклад, у Санкт-Пецярбургу...

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**

## Баляслаў ПІРШТУК, выконваючы абавязкі старшыні Гомельскага аблвыканкама, намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама:



**— За год адбылося шмат падзей, якімі можа ганарыцца Гомельшчына. У тым ліку літаральна на днях мы адкрылі новую лінію па вытворчасці флаат-шкла на ААТ «Гомельшкло». Дарэчы, у нас шмат праектаў у рабоце, і тыя, якія рэалізавалі сёлета, стварылі добры задзел на будучыню. У нас вельмі амбіцыйныя задачы. Мы павінны пачаць новую вытворчасць на ААТ «Беларускі металургічны завод» — па сутнасці, будзе пабудаваны новы завод. Запусцілі новую вытворчасць на Светлагорскім цэлюлозна-кардонным камбінаце і буйны праект у Добрушы на папяровай фабрыцы «Герой працы». У рабоце — тры буйныя праекты на дрэваперапрацоўчых прадпрыемствах у Мазыры, Гомелі, Рэчыцы. Мы распачалі маштабную мадэрнізацыю. Адным словам, ствараем умовы, якія дазволяць нам на роўных канкураваць на знешніх рынках. І ўсё гэта ўрэшце павінна спрыяць росту даходаў насельніцтва. Перад намі, як і ва ўсёй краіне, стаяць амбіцыйныя планы — выйсці на эквівалент $1000. Гэта вельмі напружаная задача, але, упэўнены, патэнцыял наш не вычарпаны. У нас добрыя кадры — як рабочых масавых спецыяльнасцяў, так і кіраўнікоў. Калі будзем зладжана працаваць, усё ў нас атрымаецца. Хочацца пажадаць нашым людзям больш аптымізму і добрага настрою на ўвесь 2013 год!**



■ Гараскоп-2013:

# ЯК ПРЫРУЧЫЦЬ ЗМЯЮ?

**У надыходзячым годзе поспех будзе спадарожнічаць усім, хто мае добрую звычку думаць, перш чым рабіць і прыслухоўвацца не толькі да чужых дэкларацый, але найперш да ўласнай інтуіцыі. Якім знакам задыяка ўдасца скарыстацца змяінай мудрасцю, а для каго ёсць небяспека прыгрэць змяю на грудзях, распавяла для чытачоў «Звязды» астролаг Аліна ВОЛКАВА.**



**АВЕНАМ** рэкамендавана кантраляваць сябе і не злоўжываць як выдаткамі на «незапланаваныя, ды прыемныя дробязі», так і ўсякімі прысмакамі і ласункамі. У абодвух выпадках здаравейшыя будзеце. А вось на чым эканоміць не варта, гэта на пачуццях і стасунках з роднымі і сябрамі. Цалкам можа быць, што менавіта дзякуючы блізкім людзям вы здзейсніце ў 2013 годзе сваю запаветную мару. Але не спяшайцеся разганяцца — сапраўды запаветную, і толькі адну. «З сярэдзіны лета, — раіць астролаг, — трэба дакладна разлічваць свае сілы, перш чым брацца за новыя справы». А на ўласцівую Авенам прагматычнасць напрыканцы года лепш увогуле забыцца, інакш атрымаецца, як у той казцы пра залатую рыбку».



Ажно да пачатку восені, прагназуюць зоркі, **ЦЯЛЬЦАМ** давядзецца працаваць за дваіх, а то і за траіх адразу. Многія, натуральна, будуць незадаволены такім станам спраў — і найперш вы самі. Але варта праявіць цярпенне і настойлівасць, і, калі ўсё зроблена правільна, ужо ўвосень вас чакае прыз. Ці суперпрыз. Ці кіндарсюрпрыз — тут зоркі не ўдакладняюць, аднак абяцаюць штосьці лёсавызначальнае і вельмі-вельмі для вас прыемнае. «Для некаторых Цяльцоў паваротным пунктам можа стаць 10 мая: у гэты дзень у знаку Цяльца адбудзецца зацьменне, — адзначае астролаг. — Усім астатнім варта абраць сваім дэвізам на наступны год два словы: «абачлівасць» і «ўмеранасць». Планаванне наперад і канкрэтыка ў жаданнях нясуць нікому не перашкодзілі».



Для большасці **БЛІЗНЯТ** год абяцае стаць неспакойным. «Самыя эмацыянальныя прадстаўнікі знака, для якіх кожная дробязь перарастае ў камедыю альбо трагедыю, пражывуць другую палову года ў раздражнёным настроі», — заўважае Аліна Волкава. Затое першае паўгоддзе прынясе шмат станоўчага — і бонусы ад зробленага ў 2012-м, і заманлівыя перспектывы ў сэнсе перамены працы або месца жыхарства. Зрэшты, з пераменай месцаў зоркі раяць не спяшацца. Чым больш бліскучай будзе тая ці іншая прапанова, тым больш старанна і ўсебакова яе трэба абдумаць. Блізнят, якім хопіць мужнасці зрабіць рашучы крок наперад (а можа, і ўбок), чакае ўвасабленне ў жыцці даўняй мары.



Некаторых **РАКАЎ** налета можа сапсаваць жыллёвае пытанне. У прынцыпе, утульнае і абароненае ад непрыемнасцяў месца жыхарства для гэтага знака заўжды знаходзілася на адным з прыярытэтных месцаў, але ў 2013-м гэта будзе сапраўдная «ідэя фікс». Калі ў барацьбе за месца пад сонцам з усім светам вы не захопіцеся ўласна працэсам барацьбы, ёсць выдатныя шанцы злавіць удачу за хвост і збудаваць сваё, персанальнае, гняздзечка, норку ці крэпасць на 10 сотках — каму што даспадобы. «Ракі — адны з тых знакаў задыяка, якім пашанцуе ў 2013 годзе, — падкрэслівае астролаг, — і калі нейкую спрыяльную магчымасць яны ўпусцяць, то выключна з-за таго, што ўчэпяцца за больш прывабную. А магчымасцяў у іх выпадзе больш, чым у каго іншага».



**ЛЬВЫ**, асабліва народжаныя ў жніўні, будуць зрываць апладысменты ва ўлюбёным рэпертуары — «сам сабе рэжысёр». Наступны год ідэальна пасуе для развіцця вашых наяўных талентаў і адкрыцця новых, пра якія ніхто, уключаючы вас саміх, увогуле не падазраваў. Правільнае іх прымяненне абавязкова станоўча адаб'ецца як на вашых фінансах, так і на пачуцці ўласнай годнасці. Няправільнае ж прымусіць перарабляць тое, што намудрыла «разумная» галава. Ва ўсякім выпадку, сумна дакладна не будзе. Толькі ў жніўні-верасні, прагназуе астролаг, варта крыху прыкруціць свой фантан ідэй і не ўздымацца празмерна высока — ёсць рызыка балюча ўпасці ды набіць гузакоў.



Цвёрдую глебу пад нагамі намацаюць тыя з **ДЗЕЎ**, якія страцілі жыццёвыя арыенціры і ўпэўненасць у сваіх сілах. «Для гэтага трэба ўсяго нічога і адначасова так многа — перастаць імкнуцца стаць тым, кім вас хочуць бачыць навакольныя, і застацца самім сабой, — развважае астролаг. — Пасля гэтага лёгка і камфортна будзе як вам, так і блізкім людзям з вамі». А душэўны спакой, мяркуючы па ўсім, будзе Дзевам вельмі неабходны: многіх прадстаўнікоў знака падсцерагаюць бытавыя праблемы, канфлікты са сваякамі і непростая сітуацыя на працы. І ўсё ж не збочвайце з абранага (вамі, а не кімсьці збоку) шляху, і тады ўжо напрыканцы чэрвеня ваша мудрасць і практычнасць дадуць плён.



Высвятленне адносін і пошук адказу на пытанне, хто вам сапраўдны сябар, а хто — так, міма крочыў, стануць лейтматывам першага паўгоддзя для **ШАЛЯЎ**. Толькі не спяшайцеся скардзіцца на жыццё: некаторыя людзі яго марнуюць, каб атрымаць вынікі, якіх вы дасягнеце за нейкія 5-6 месяцаў. «Увогуле, абставіны складваюцца для Шаляў вельмі спрыяльна, трэба толькі пастарацца, каб з дзвюх вашых існасцяў пераважыў аптымізм, — адзначае Аліна Волкава. — А гэта ўжо, самі разумееце, не ад зорак залежыць, а ад унутранай матывацыі. Хто правільна настроіцца — напрыканцы года збярэ такі ўраджай, што ўсе астатнія счарнеюць ад зайздрасці». У прыватнасці, менавіта ў 2013 годзе многія Шалі змогуць падступіцца да кар'еры, пра якую заўжды марылі.



Адвечная дылема чакае налета **СКАРПІЁНАЎ** — як захаваць добрыя стасункі з сябрамі і калегамі, пры гэтым не даўшы наваліць на сябе чужую працу і вырашэнне чужых праблем. Забягаючы наперад, адзначым, што спалучэнне прыроднай тактоўнасці і найцвярдзейшага ўнутранага стрыжня дазволіць Скарпіёнам з гонарам вытрымаць выпрабаванне. Цалкам лагічна, што напрыканцы года прадстаўнікі гэтага знака будуць святкаваць трыумф, велічна насіць лаўры, купацца ў промнях славы, атрымліваць заслужаныя падарункі і ўсякія іншыя прыемныя рэчы, што да сану пераможцам. «Тым Скарпіёнам, хто ўнутрана гатовы да сур'ёзных перамен, раю звярнуць увагу на 3 лістапада: у гэты дзень у вашым знаку адбудзецца сонечнае зацьменне, якое можа стаць адпраўным пунктам такіх перамен», — прагназуе астролаг.



З усіх пачуццяў найгалоўнейшым для **СТРАЛЬЦОЎ** у 2013 годзе павінна стаць інтуіцыя. Менавіта яе ціхі голас, калі яго ў патрэбны момант пачуць, дапаможа вам зберагчы шмат сіл, часу, нерваў і грошай. «У другой палове года Юпіцер, які зноў развернецца ў ваш бок, дазволіць прыняць некаторыя важныя рашэнні ў сферы пачуццяў, а для народжаных у першай дэкадзе снежня Стральцоў — і ў сферы бізнэсу», — заўважае астролаг. Істотна паўплываюць на ваша жыццё і блізкія людзі. Калі сярод іх ёсць надзейныя Дзевы і нясхільныя Скарпіёны — спіце спакойна: непрыяцель у ваш стан не пройдзе.



Бізнэс і кар'ера **КАЗЯРОГАЎ** у наступным годзе залежаць найперш ад забеспячэння сяброўствам. Хоць вы і няблага сыходзіцеся з людзьмі, аддзяляйце прыяцеляў ад аднадумцаў — першыя ў цяжкай сітуацыі хіба паспачуваюць, затое другія рэальна дапамогуць. Калі вы адкладвалі «на потым» нейкія сур'ёзныя крокі на працы ці ў сямейным жыцці — у другой палове года гэта «потым», нарэшце, прыйдзе. «З пачатку лістапада і да сакавіка 2014 года ў большасці Казярогаў наступае спрыяльны перыяд, — падкрэслівае Аліна Волкава, — якім грэх не скарыстацца. Без лішняй сціпласці прымайце і назапашвайце кампліменты, пазітыўныя эмоцыі, яркія пачуцці, творчыя ідэі і вельмі, вельмі шмат любові».



Да пачатку лета адзінокім **ВАДАЛЕЯМ** выпадзе шанц, а можа, і не адзін, сустрэць сваё сапраўднае каханне. Праўда, нягледзячы на ўсю глыбіню пачуццяў, гатоўнасці раствярыцца ў каханым Вадалеям хопіць ненадоўга, і ўжо праз некалькі месяцаў мяцежны дух свабоды крыху прызямліць узнёслую рамантыку. Дарэчы, ёсць цудоўны спосаб і пачуцці зберагчы, і той самы дух утаймаваць: як мага больш часу праводзіць у паездках і вандроўках — падарожжа сумесных. «Напрыканцы года тыя нямногія Вадалеі, каго можна аднесці да кар'ерыстаў, выйграюць забег на новую пасаду, але затое рызыкуюць упусціць асабістае шчасце, — папярэджвае астролаг. — На жаль, утрымаць адначасова і тое, і тое не атрымаецца. Запасіцеся цярпеннем, і ў 2014 годзе сітуацыя зменіцца да лепшага».



Што б ні выпала на долю **РЫБ** у 2013 годзе, у выніку яны застануцца як мінімум пры сваіх інтарэсах, а найчасцей — з выйгрышам. Нават калі вы крыху саступіце заваяваныя пазіцыі, працягнецца гэта нядоўга, а з чэрвеня ўвогуле над вамі бясхмарнае неба і залатое сонца, закрывацца ад якога парасонам строга не рэкамендуецца. Бо можна і прапусціць самы зручны момант для ўзлёту — а ён абяцае быць імклівым і ўдалым, як ніколі. Смела рэалізуйце ўсё тое, на што раней не асмельваліся — калі яшчэ такое будзе, што практычна ўсе зоркі на вашым баку? «У 2013 годзе Рыбы адкрыюць у сабе новыя таленты, магчыма, атрымаюць дадатковую адукацыю ці паспрабуюць сябе ў зусім нечаканай сферы, — прадказвае Аліна Волкава. — Паспяховым будзе як індывідуальны бізнэс, так і праца ў камандзе».

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

■ Тэлеменю

# НАПЕРАД, З ПЕСНЯМІ!

**Сёлета сустрэча Новага года ў кампаніі з блакітным экранам абяцае стаць, бадай, самай меладычнай за апошнія некалькі гадоў. Усе без выключэння беларускія тэлеканалы будуць частаваць гледачоў музычна-забаўляльнымі нарэзкамі. Зрэшты, песні — не шампанскае, іх на свяце ніколі зашмат не бывае.**

**Прыглядзімся ж больш пільна да навагодняга тэлевізійнага меню, каб вызначыцца, што з чым лепш чаргаваць, а што змешваць, але не баўтаць.**

## Сустрэча з шампанскім

Як дагэтуль многія таты пераапранаюцца за дзвярыма ў чырвоны халат і чапляюць маскарадную бараду, так і традыцыйная праграма «Месца сустрэчы» з вядучымі Дзянісам Дудзінскім і Вольгай Рыжыкавай пад Новы год набудзе адпаведны настрой. У рэпрызах паміж выступленнямі госці (сярод якіх аказаліся нават знакамітыя футбалісты) і ўдзельнікі канцэрта адчуюць усё хараство ранішніка: хто будзе дэкламаваць вершы, хто спяваць песні «на зэдлічку», хто выконваць іншыя дзіўныя даручэнні, гуляючы ў навагоднія фанты...

Што да ўласна музычнай часткі, то яна парадуе аматараў рэтра-дыскатэкай а-ля 80-90-я. Артысты — Ірына Дарафеева, Іна Афанасьева, Алена Ланская, Іскуі Абалян, Дзмітрый Калдун, Аляксей Хлястоў, гурты «Песняры», «Лепрыконсы» ды іншыя — будуць перапяваць на новы лад самыя гарачыя хіты менавіта гэтага перыяду.

Акрамя таго, 31 снежня тыя, хто дагэтуль не мог паверыць у перамогу Алены Ланской ці ўвогуле прапусціў сёлетнія жарсці па «Еўрабачанні», змогуць запоўніць прабелы і паглядзець паўтор фіналу Нацыянальнага адборачнага тура конкурсу песні «Еўрабачанне-2013».

## Караоке пад аліўе

Штогод на крымскіх курортах з нецярпеннем чакаюць беларусаў: як прызнаюцца мясцовыя жыхары, ніхто так палка, шчыра і заўзята не «выводзіць» у караоке, як нашы суайчыннікі. Што рабіць, калі лета яшчэ чакаць і чакаць, а душа просіць песень? Уключайце «Беларусь 2».

Упрыгажэннем навагодняй ночы тут мусіць стаць дэбютант гэтага сезона, народнае караоке-шоу «Імперыя песні». Да поўначы складаць кампанію і стварыць патрэбны настрой гледачам будуць упадабаныя за некалькі месяцаў канкурсанты праекта з песенькамі пра 5 хвілін, народжаную ў лесе елачку ды іншую атрыбутыку свята. А вось першыя гадзіны новага, 2013 года, аздобяць спевамі прафесіяналы — Ганна Шаркунова, Вікторыя Алешка, гурт «Да Вінчы», ансамбль «Бяседа» ды многія іншыя. Дарэчы, усім ім таксама можна будзе падпяваць: як абяцае аўтар і вядучы шоу Дзмітрый Карась, у навагоднім караоке, як і ў звычайным, у дапамогу гледачам на экране будзе бегчы радок з тэкстам кожнай песні.

## Марціні з мачанкай

Тэлеканал заваблівае на свой навагодні агеньчык арыгінальнасцю падыходу. Па-першае, папулярных беларускіх артыстаў аб'ядналі ў даволі нечаканыя дуэты. Па-другое, выконваць гэтыя дуэты будуць не вытрымкі з рэпертуару сябе, любімых, а версіі сусветна вядомых хітоў — але на беларускай мове! Уключыўшы пэўную фантазію, можна будзе ўявіць, што Іскуі Абалян сапраўды ператварылася ў святочную ноч у шведскую пераможцу мінулага «Еўрабачання» Лорын, Вікторыя Алешка стала Шакірай, а гурт «Песняры» — легендарнымі Eagles.

Аднак сапраўднай бомбай падчас запісу праграмы стала выступленне не артыстаў, а... стыліста. Беларускі адказ Сяргею Звераву і канкурэнтаздольны выклік прафесіяналам эстраднага цэха падрыхтавалі Наталі Рашэ і Аляксандр Кірынюк.

## «Капуснік» з мандарынамі

Тут вырашылі стварыць музычны фільм пра тое, як здымаецца фільм. За аснову ўзялі добра вядомыя і любімыя сцэны з савецкай класікі. А на пробы запрасілі... не, не беларускіх артыстаў (пагадзіцеся, сумна штогод назіраць за аднымі і тымі ж асобамі, няхай сабе і ў новых вобразах, на розных «кнопках»), а ўласных тэлевядучых.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У выніку вядучая навін і ток-шоу Кацярына Забянько, схаваўшыся ў тэлефоннай будцы, спрабавала ўвасобіць вядомы эпізод з «Карнавала», Ніна Багданава (*на фота*) і Дзмітрый Врангель ужываліся ў ролі Ніны і Шурыка з «Каўказскай палонніцы», а гумарыст і балака Антон Мартыненка спрабаваў наноў расчуліць публіку гісторыяй пра «Востраў нешанцавання».

Усяго ў мюзікл увайшлі 13 кінаэпізодаў — у гонар надыходнага 2013 года.

**Падрыхтавала Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■

